Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”

# *Праектаванне вучэбных заняткаў з выкарыстаннем сучасных метадаў, сродкаў і форм навучання, накіраваных на дасягненне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў*



Матэрыялы абласнога семінара

Гомель, 2023

**Удзельнікі семінара:** метадысты устаноў (арганізацый), якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, кіраўнікі ВМА, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры

**Дата правядзення:** 18 кастрычніка 2023 года

**Месца правядзення:** ДУА "Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна"

**Форма правядзення:** семінар-практыкум

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў у праектаванні вучэбных заняткаў з выкарыстаннем сучасных метадаў, сродкаў і форм навучання, накіраваных на дасягненне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў

**Задачы:**

стварыць умовы для засваення педагогамі актуальных для сістэмы адукацыі вобласці праблем арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры і вызначэння шляхоў і рэзерваў іх пераадольвання;

актуалізаваць веды педагагічных работнікаў аб сутнасці асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання па беларускай мове і літаратуры;

пашырыць уяўленні педагогаў аб метадах, сродках і формах навучання, накіраваных на дасягненне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў па беларускай мове і літаратуры;

прадэманстраваць прадуктыўны педагагічны вопыт выкарыстання ў адукацыйным працэсе эфектыўных метадаў, сродкаў і форм навучання, якія садзейнічаюць павышэнню выніковасці адукацыйнага працэсу.

## Парадак правядзення семінара

| | | |
|---|---|---|
| **09.00 - 10.00**<br>фае 2-га паверха | **Рэгістрацыя ўдзельнікаў семінара** | |
| | *Рапінчук Ірына Аляксандраўна* | *намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА "Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна"* |
| **09.00 - 10.00**<br>фае 2-га паверха | **Галерэя вопыту работы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Жлобінскага раёна** | |
| | *Трубілава Алена Іванаўна* | *метадыст ДУ "Жлобінскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"* |
| **10.00 - 10.10**<br>актавая зала | **Адкрыццё семінара** | |
| | *Блажко Вольга Аляксандраўна* | *прарэктар па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі "Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі" (далей – ГАІРА )* |
| **10.10 - 10.40**<br>актавая зала | **Кіраванне прафесійным ростам педагога як умова павышэння выніковасці адукацыйнага працэсу** | |
| | *Сторож Святлана Іванаўна* | *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА* |
| **10.40 - 10.55**<br>актавая зала | **Адукацыйная прастора Жлобінскага раёна** | |
| | *Федарава Алена Леанідаўна* | *загадчык ДУА "Жлобінскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **10.55 - 11.20**<br>каб.2-7 | **Фрагмент урока беларускай мовы ў 5 класе. “Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне”** | | |
| | *Лебедзева Наталля Сяргееўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна”* | |
| **11.20 - 11.45**<br>каб. **2-9** | **Фрагмент урока беларускай літаратуры ў 9 класе. “Гімны роднай зямлі”. М.Гусоўскі “Песня пра зубра”** | | |
| | *Астапенка Ірына Генадзьеўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна”* | |
| **11.45 – 12.30**<br>каб.2-7 | **Майстар-клас “Выкарыстанне рабочага ліста як спосаба арганізацыі дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы”** | | |
| | *Жгарова Валянціна Мікалаеўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” ДУА “Камунараўская сярэдняя школа Буда-Кашалёўскага раёна”* | |
| **12.30 - 13.15**<br>каб.2-9 | **Майстар-клас “Кампетэнтнасна арыентаваныя заданні – інструмент ўрока беларускай літаратуры па развіцці камунікацыі”** | | |
| | *Есіс Яўген Валер’евіч* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”ДУА “Сярэдняя школа №16 г.Мазыра”* | |
| **13.15 - 13.45**<br>каб.2-7 | **Педагагічная майстэрня “4:1: вынік ідавочны. Прыём РАФТ пры навучанні стварэнню тэкстаў”** | | |
| | *Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна* | *дырэктар ДУА “Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна”, настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”* | |
| **13.45 - 14.15**<br>каб.2-9 | **Педагагічная майстэрня “Выкарыстанне прыёма “Трыміно” на розных этапах ўрока для дасягнення вынікаў навучання”** | | |
| | *Шаўчэнка Таццяна Мікалаеўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №7 г.Жлобіна”* | |
| **14.15 - 15.00**<br>Актавая зала | **Падвядзенне вынікаў семінара. Абмен думкамі** | | |
| | *Блажко Вольга Александраўна* | *прарэктар па вучэбнай рабоце ГАІРА* | |

## Кіраванне прафесійным ростам педагога як умова павышэння выніковасці адукацыйнага працэсу

*Стораж Святлана Іванаўна,*
*начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Якаснае кіраванне прафесійным ростам педагога спрыяе павышэнню эфектыўнасці адукацыйнага працэсу. Прааналізуем колькасны і якасны саставы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці.

Адукацыйны працэс па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” згодна дадзеным уліку педагагічных кадраў вобласці па стане на кастрычнік 2023 года забяспечваюць 1177 настаўнікаў. 99,15% з іх маюць вышэйшую адукацыю. 1,95% ад агульнай колькасці настаўнікаў працуюць на пасадзе настаўніка беларускай мовы і літаратуры першы год. Такія педагогі ёсць амаль у кожным раёне. У дэкрэтным адпачынку знаходзяцца 5,35% педагогаў, пенсіянерамі з’яўляюцца 11,13% настаўнікаў. 21,41% педагога з’яўляюцца старшынямі раённых ці школьных вучэбна-метадычных аб’яднанняў. Выкладаюць беларускую мову ў класах ці групах з павышаным узроўнем яе вывучэння 7,05% настаўнікаў.

Спецыялізацыю па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”маюць не ўсе настаўнікі (1141 настаўнік – 93,56%), для 209 педагогаў гэтыя вучэбныя прадметы не з’яўляюцца асноўнымі (сумясціцельства).




Разгледзем кваліфікацыйны ўзровень настаўнікаў, для якіх вучэбныя прадметы “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”з’яўляюцца асноўнымі.

86,23% настаўнікаў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі “настаўнік-метадыст”, вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі. Гэта лепшы

паказчык за апошнія 5 гадоў. Станоўчая дынаміка павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў назіраецца ва ўсіх раёнах вобласці. Адбываецца павелічэнне колькасці настаўнікаў з кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”.

Гэтай катэгорыі ўдастоены 459 педагогаў рэспублікі, 69 з іх – у Гомельскай вобласці; з 43 настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі ўсёй рэспубліцы – 10 з Гомельскай вобласці.




Іх вопыт трэба выкарыстоўваць для падрыхтоўкі педагогаў, якія могуць прэтэндаваць на прысваенне вышэйшай, першай і другой кваліфікацыйных катэгорый. У гэтым напрамку дзейнасці ў параўнанні з 2016 годам назіраецца станоўчая дынаміка, аднак па стане на пачатак 2023/2024 навучальнага года, як

і раней, мы маем вялікую колькасць педагогаў, якія не выкарыстоўваюць права павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню. У кастрычніку 2023 года гэта лічба склала 246 педагогаў, крыху болей за 20,9% ад агульнай колькасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры нашай вобласці.




На працягу кожнага навучальнага года ад устаноў адукацыі вобласці пасупаюць накірункі на здачу кваліфікацыйнага экзамена пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.




На базе ГАІРА, у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі за апошнія 6 навучальных гадоў 348 настаўнікаў паспяхова здалі экзамен на вышэйшую катэгорыю. Аднак назваць актыўным удзел раёнаў у гэтым працэсе мы не можам, бо амаль такая ж колькасць настаўнікаў складае рэзерв.

За 2022/2023 навучальны год 30 педагогаў прымалі ўдзел у экзаменах, для 18 з якіх ён быў выніковым.

Кармянскі (3), Мазырскі (2), Буда-Кашалёўскі (1), Лельчыцкі (1), Рагачоўскі (1), Хойніцкі (1), Чачэрскі (1) раёны, Чыгуначны (1) і Цэнтральны (1) раёны г.Гомеля, а таксама Гомельскае кадэцкае вучылішча (1) забяспечылі якасны ўдзел настаўнікаў рэзерва ў экзаменах.

Жыткавіцкі (2 з 3), Савецкі раён (2 з 3) г.Гомеля, Рэчыцкі (1 з 2) раёны праводзілі работу ў гэтым напрамку дзейнасці недастаткова: не ўсе іх педагогі справіліся з выпрабаваннем экзаменам.

Акцябрскі (1), Калінкавіцкі(1), Лоеўскі(1), Петрыкаўскі(1), Светлагорскі (1), Веткаўскі (4) – накіравалі настаўнікаў, але яны не змаглі здаць экзамен на вышэйшую катэгорыю.

Не накіроўвалі настаўнікаў на здачу экзамена Брагінскі, Гомельскі, Добрушскі, Ельскі, Жлобінскі, Нараўлянскі раёны, Навабеліцкі раён г.Гомеля.

Для якаснай падрыхтоўкі да праходжання педагогамі атэстацыі лічым неабходным забяспечыць сістэмнасць у рабоце па падрыхтоўцы настаўнікаў да ўсіх этапаў атэстацыі. Мэтазгодна арганізаваць трансляцыю вопыта педагогаў, якія паспяхова прайшлі атэстацыю, прапанаваць ім падзяліцца ўражаннямі аб экзамене, расказаць аб заданнях, заўвагах камісіі і г.д. Карысным будзе правядзенне практычных заняткаў па распрацоўцы тэхналагічных карт (планаў-канспектаў, сцэнарыяў у адпаведнасці з тыпам, мэтамі і задачамі этапаў урока, падборам зместу, адборам метадаў, прыёмаў і форм работы) урокаў, абагульненні асабістага педагагічнага вопыту.

Задача метадычных служб заключаецца яшчэ і ў тым, каб садзейнічаць засваенню педагогамі зместа нарматыўных прававых дакументаў і інструктыўна-метадычных матэрыялаў (пералік якіх уключаны ў змест праграмы экзамена і спецыфікацыі білета для экзамена на вышэйшую катэгорыю), актуалізацыі ведаў па вучэбных прадметах. Гэта таксама лепш рабіць у практычнай форме.

Для забяспечання практычнай падрыхтоўкі педагогаў раім выкарыстоўваць матэрыялы сайта інстытута. Праз радок меню трэба перайсці ў раздзел “Атэстацыя”, у якім выбраць падраздзел “Кваліфікацыйны экзамен”. Тут размешчана спецыфікацыя білета для кожнай катэгорыі настаўнікаў. У адпаведнасці з ёй распрацоўваюцца білеты да экзаменаў. Праходжанне пробнага тэсціравання дазваляе не толькі атрымаць уяўленні аб змесце заданняў экзамена, але і выявіць прабелы ў сваіх ведах.

Комплекснае суправаджэнне падрыхтоўкі настаўнікаў у перыяд атэстацыі спрыяе не толькі станоўчаму яе праходжанню, а і наогул, павышэнню якасці адукацыйнага працэсу.

Разгледзім асноўныя паказчыкі якасці адукацыі.

Пачнем з вынікаў цэнтралізаванага экзамена 2023 года.

Усяго па вобласці ЦЭ па беларускай мове здавала 1710 выпускнікоў. Сярэднеабласны бал па беларускай мове склаў 66,72. Гэта на 4,37 бала вышэй за сярэдні абласны бал па ўсіх прадметах (62,35 балаў). Дыяпазон балаў склаў ад 0 мінімальных да 100 максімальных.

## Вынікі ЦЭ 2023

**100 балаў – 65**

| Раён | Колькасць |
|---|---|
| Веткаўскі | 1 |
| Гомельскі | 2 |
| Добрушскі | 1 |
| Ельскі | 1 |
| Жыткавіцкі | 1 |
| Жлобінскі | 10 |
| Лоеўскі | 1 |
| Мазырскі | 4 |
| МДАЛ | 9 |
| Рагачоўскі | 3 |
| Светлагорскі | 8 |
| Хойніцкі | 2 |
| Цэнтральны | 5 |
| Навабеліцкі | 3 |
| Савецкі | 3 |
| ГДАЛ | 11 |

| Раён | Бал | Колькасць |
|---|---|---|
| Веткаўскі | 0 | 1 |
| Лельчыцкі | 1, 5, 10 | 3 |
| Гомельскі | 3-4 | 2 |
| Жыткавіцкі | 3-4, 6, 9 | 4 |
| Кармянскі | 4-5, 7 | 3 |
| Петрыкаўскі | 5, 10 | 2 |
| Калінкавіцкі | 6, 9, 10 | 3 |
| Ельскі | 7 | 1 |
| Цэнтральны | 7 | 1 |
| Брагінскі | 9-10 | 2 |
| Чачэрскі | 9 | 1 |
| Мазырскі | 10 | 2 |
| Рэчыцкі | 10 | 1 |

**0-10 балаў – 26**

У 2023 годзе ўладальнікамі 100-бальных сертыфікатаў па беларускай мове сталі 413 удзельнікаў ЦЭ усёй рэспублікі, 65 з якіх – выпускнікі ўстаноў адукацыі нашай вобласці. Добрасумленная плённая праца і правільнае, граматнае супрацоўніцтва з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі даюць шанец не толькі выбраным, а усім, хто насамрэч сур’ёзна і мэтанакіравана рыхтуецца да ЦЭ, паказаць лепшы вынік.

26 выпускнікоў набралі ад 0 да 10 балаў (раёны прадстаўлены ў табліцы). У чым прычына такіх вынікаў? Магчыма, нізкая стрэсаўстойлівасць вучняў, недасканалая профарыентацыйная работа, а можа і нізкі ўзровень прафесійных ведаў педагога. У любым выпадку, гэтыя дадзеныя – прадмет сур’ёзнага, дэтальнага аналізу прычын такіх нізкіх вынікаў і вызначэння шляхоў іх пераадольвання.

Для павышэння вынікаў цэнтралізванага экзамена лічым мэтазгодным:

садзейнічаць удасканаленню кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўнікаў і забяспечыць аб’ектыўнасць ацэньвання навучэнцаў. Гэта дазволіць пазбегнуць сітуацый, калі вучань мае больш высокі за яго рэальныя веды бал і вырашае рызыкнуць і пайсці на ЦЭ;

неабходна забяспечыць сістэмнасць і бесперапыннасць у падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ;

з улікам рэкамендацый па выніках ЦЭ трэба праводзіць шэраг метадычных мерапрыемтсваў на базе ўстаноў раёна, а таксама арганізоўваць дзелавую гульню, аналагічную дыягнастычнаму тэсціраванню, якая ўжо двойчы праводзілася для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці;

абавязковай умовай лічым забеспячэнне ўдзелу школьнікаў у рэпетыцыйным тэсціраванні і зрэз-тэстах.

Немалаважным паказчыкам якасці ведаў вучняў з’яўляецца выніковы ўдзел у алімпіядным руху. Вынікі выступлення навучэнцаў Гомельскай

вобласці на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры за апошнія 7 гадоў прадстаўлены ў табліцы:

| Раён, установа | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Акцябрскі | | | 1 | | 2 | | |
| Брагінскі | | | | | | | 1 |
| Добрушскі | | 1 | | | | | |
| Жлобінскі | 1 | 2 | | | | | 2 |
| Жыткавіцкі | 1 | | | | | | |
| Лоеўскі | | | | | | | 1 |
| Мазырскі | | 1 | 1 | | 2 | 2 | 1 |
| г.Гомель | | | 1 | | | | |
| Рагачоўскі | | | | | | | 1 |
| Рэчыцкі | | 1 | | | 1 | | |
| Савецкі | | 1 | 1 | 2 | | 1 | 4 |
| Светлагорскі | | | | | 1 | 1 | |
| Цэнтральны | | | | | 3 | 2 | 1 |
| ГДАЛ | | | | | 1 | 1 | |
| МДАЛ | | | | | 1 | | |

У 2023 годзе дыпломы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды атрымалі вучні Брагінскага, Жлобінскага, Лоеўскага, Мазырскага, Рагачоўскага раёнаў, Савецкага і Цэнтральнага раёнаў г.Гомеля.

Па выніках трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры штогадова дыпломы заваёўваюць вучні Акцябрскага, Брагінскага, Добрушскага, Ельскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Мазырскага, Петрыкаўскага, Рагачоўскага, Светлагорскага раёнаў, Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля, Гомельскага абласнога ліцэя.

**Стабільныя вынікі**

| Раён, установа | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Савецкі | 7 | 9 | 9 |
| Светлагорскі | 6 | 5 | 4 |
| Жлобінскі | 5 | 3 | 6 |
| Цэнтральны | 5 | 5 | 3 |
| Мазырскі | 3 | 2 | 4 |
| Акцябрскі | 2 | 2 | 2 |
| Петрыкаўскі | 2 | 3 | 1 |
| Брагінскі | 1 | 1 | 3 |
| Добрушскі | 2 | 1 | 2 |
| Чыгуначны | 1 | 2 | 2 |
| ГДАЛ | 1 | 2 | 2 |
| Ельскі | 1 | 1 | 2 |
| Калінкавіцкі | 1 | 2 | 1 |
| Рагачоўскі | 1 | 1 | 2 |

**Нестабільныя вынікі**

| Раён, установа | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Рэчыцкі | 3 | 1 | |
| Лельчыцкі | | 2 | 1 |
| Лоеўскі | | 1 | 2 |
| МДАЛ | 2 | 1 | |
| Жыткавіцкі | | 1 | 1 |
| Кармянскі | 1 | 1 | |
| Буда-Кашалёўскі | 1 | | |
| Веткаўскі | | 1 | |
| Гомельскі | | | 1 |
| Навабеліцкі | | | 1 |

Нараўлянскі
Хойніцкі
Чачэрскі
г.Гомель (падведамасныя)
ГКУ
0

Астатнія 8 раёнаў вобласці, Навабеліцкі раён г.Гомеля, а таксама Мазырскі дзяржаўны абласны ліцэй маюць нестабільныя вынікі.

На працягу апошніх трох гадоў не маюць пераможцаў на трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды Нараўлянскі, Хойніцкі, Чачэрскі раёны, установы падпарадкавання упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, Гомельскае кадэцкае вучылішча.

Аналізуючы ўдзел у абласной алімпіядзе вучняў 4-9 класаў за 3 апошнія гады, неабходна адзначыць, што штогадова маюць пераможцаў Добрушскі раён (стабільна аднолькавыя вынікі); Жлобінскі, Брагінскі, Петрыкаўскі раёны, Цэнтральны і Навабеліцкі раёны г.Гомеля (стабільна станоўчая дынаміка); Мазырскі, Светлагорскі, Акцябрскі, Калінкавіцкі, Рагачоўскі, Рэчыцкі раёны, Савецкі і Чыгуначны раёны г.Гомеля (стабільна адмоўная дынаміка).

**Стабільныя вынікі**

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Добрушскі | 1 | 1 | 1 |

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Жлобінскі | 3 | 4 | 5 |
| Цэнтральны | 1 | 3 | 3 |
| Брагінскі | 1 | 1 | 2 |
| Навабеліцкі | 1 | 1 | 2 |
| Петрыкаўскі | 1 | 1 | 2 |

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Мазырскі | 6 | 10 | 8 |
| Савецкі | 9 | 6 | 4 |
| Светлагорскі | 8 | 7 | 3 |
| Чыгуначны | 5 | 3 | 4 |
| Акцябрскі | 3 | 4 | 2 |
| Калінкавіцкі | 3 | 3 | 1 |
| Рагачоўскі | 3 | 2 | 1 |
| Рэчыцкі | 2 | 3 | 1 |

**Нестабільныя вынікі**

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Ельскі | | | 1 |
| Нараўлянскі | 1 | | 1 |
| Чачэрскі | 1 | | 1 |

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Гомельскі | 1 | 1 | |
| Жыткавіцкі | 1 | | |
| Кармянскі | | 1 | |
| Лельчыцкі | 2 | | 1 |
| Лоеўскі | 1 | | |

Буда-Кашалёўскі
Веткаўскі
Хойніцкі
г.Гомель (падведамасныя)
ГКУ
0

Прадстаўнікі Ельскага, Нараўлянскага, Чачэрскага раёнаў дэманструюць нестабільна станоўчыя вынікі, Гомельскага, Жыткавіцкага, Кармянскага, Лельчыцкага, Лоеўскага раёнаў –нестабільныя вынікі з адмоўнай дынамікай.

Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі і Хойніцкі раёны, установы падпарадкавання упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, Гомельскае кадэцкае вучылішча не маюць пераможцаў 3 апошнія гады правядзення алімпіяды.

Пры аналізе пераемнасці ўдзелу вучняў у рэспубліканскай і абласной алімпіядах за апошнія 3 гады адзначана стабільнасць вынікаў прадстаўнікоў Акцябрскага, Брагінскага, Добрушскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Мазырскага, Рагачоўскага, Светлагорскага раёнаў, Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў г.Гомеля.

Няма ні аднаго пераможцы за 5 апошніх гадоў на трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды і на абласной алімпіядзе ў Хойніцкім раёне, установах падпарадкавання упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама і Гомельскім кадэцкім вучылішчы.

Астатнія раёны вобласці дэманструюць папераменныя поспехі.

Алімпіядны рух патрабуе сістэмнай работы з улікам пераемнасці, пачынаючы ўжо з пачатковых класаў. Важна берагчы і падтрымліваць

цікавасць дзіцяці да вывучэння прадмета і да ўдзела ў алімпіядным руху. Для этага неабходна тлумачыць самім вучням, іх бацькам тыя станоўчыя моманты, якія атрымлівае пераможца трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды. Неаходна ўлічваць, што ў алімпіядных заданнях за апошнія 3 гады абавязкова сустракаюцца заданні, звязаныя з жыццёвым і творчым шляхам пісьменнікаў-юбіляраў, кнігамі-юбілярамі, чытацкай адукаванасцю, культурай і мастацтвам.

Для падтрымкі цікавасці да вывучэння роднай мовы і літаратуры ва ўстанове адукацыі павінна быць створана такая сістэма работы, калі мерапрыемствы праводзяцца не толькі ў межах прадметнага тыдня, а на працягу ўсяго года з абавязковым удзелам алімпіяднікаў.

Трэба пачынаць падрыхтоўку да водгука не з 9 класа, а значна раней, негледзячы на тое, што падчас абласной алімпіяды такі тур не праводзіцца. Менавіта па гэтым туры многія удзельнікі атрымліваюць балы, значна ніжэйшыя за комплексную работу. Добрай падрыхтоўкай да рэспубліканскай алімпіяды з’яўляецца ўдзел у абласных конкурсах.

**Лінгвістычны конкурс "Ведай родную мову"**

**Маюць пераможцаў**

штогадова

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Акцябрскі | 2 | 1 | 1 |
| Мазырскі | 3 | 2 | 2 |
| Савецкі | 1 | 4 | 6 |
| Цэнтральны | 3 | 3 | 2 |

двойчы

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Жлобінскі | 2 | | 1 |
| Лоеўскі | | 1 | 1 |
| Светлагорскі | | 2 | 3 |

аднойчы

| Раён | 2021 | 2022 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Брагінскі | | | 3 |
| Добрушскі | | 1 | |
| Петрыкаўскі | 1 | | |
| Рагачоўскі | | 1 | |
| Рэчыцкі | | 1 | |
| Чыгуначны | | 1 | |






**Не маюць пераможцаў**

| Раён, установа |
|---|
| Буда-Кашалёўскі |
| Веткаўскі |
| Гомельскі |
| Ельскі |
| Жыткавіцкі |
| Калінкавіцкі |
| Кармянскі |
| Лельчыцкі |
| Нававеліцкі |
| Нараўлянскі |
| Хойніцкі |
| Чачэрскі |
| г.Гомель (падведамасныя) |
| ГКВ |

У перыяд трэніровачных збораў праводзіцца лінгвістычны конкурс па беларускай мове і літаратуры “Ведай родную мову”. Гэты конкурс ставіць на мэце падрыхтоўку вучняў да комплекснай работы і напісання водгуку. Апошнія гады ў конкурсе прымаюць удзел пераможцы трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды.

Аналізуючы вынікі конкурсу, становіцца зразумела, што ў шэрагу раёнаў пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды настаўнікі недастаткова ўвагі надаюць навучанню алімпіяднікаў напісанню водгука, таму па конкурсным заданні “напісанне міні-сачынення” атрымліваюць вельмі нізкія балы, што не дазволіла ні ў адзін год атрымаць дыплом пераможцы.

## Абласны конкурс рытарычнага майстэрства «Гавары са мной па-беларуску»

**Маюць пераможцаў**

| Раён | 2019 | 2020 | 2022 |
|---|---|---|---|
| Добрушскі | 1 | 1 | 1 |
| Жлобінскі | 1 | 1 | 2 |
| Калінкавіцкі | 2 | 2 | 1 |
| Мазырскі | 2 | 2 | 2 |
| Навабеліцкі | 1 | 1 | 1 |
| Нараўлянскі | 1 | 1 | 1 |
| Рэчыцкі | 2 | 2 | 1 |
| Савецкі | 2 | 2 | 9 |
| Светлагорскі | 2 | 2 | 3 |
| Цэнтральны | 1 | 1 | 1 |



| Раён | 2019 | 2020 | 2022 |
|---|---|---|---|
| Брагінскі | | | 2 |
| ГДАЛ | | | 1 |
| г.Гомель (падведамасныя) | 1 | | |
| Гомельскі | | | 1 |
| Ельскі | | | 2 |
| Кармянскі | | | 1 |
| Лоеўскі | | | 1 |
| МДАЛ | 1 | | |

| Раён | 2019 | 2020 | 2022 |
|---|---|---|---|
| Акцябрскі | 1 | 1 | |
| Буда-Кашалёўскі | 1 | 1 | |
| Лельчыцкі | 2 | 2 | |
| Петрыкаўскі | 2 | 2 | |
| Рагачоўскі | 1 | 1 | |
| Чыгуначны | 2 | 2 | |

**Не маюць пераможцаў**

| Раён |
|---|
| Веткаўскі |
| ГКВ |
| Жыткавіцкі |
| Хойніцкі |
| Чачэрскі |

Абласны конкурс рытарычнага майстэрства “Гавары са мной па-беларуску” праводзіцца з мэтай развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнцаў, павышэння агульнага культурнага ўзроўню гаварэння, фарміравання ў навучэнцаў спецыяльных камунікатыўных уменняў і навыкаў, выяўлення здольных і лінгвістычна адораных дзяцей. Гэты конкурс дазваляе палепшыць якасць падрыхтоўкі да напісання водгуку.

У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы IX-XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з ліку пераможцаў другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”.

## Рэспубліканскі конкурс работ даследчага характару




гімназія №51 г.Гомеля

Кірушкіна Марыя Іванаўна
Афанасьева Наталля Васільеўна
Крэч Таццяна Сяргееўна
Дарошка Таццяна Іванаўна
Дземішкан Вольга Ігараўна

Удзел у рэспубліканскім конкурсе даследчых работ (канферэнцыях) вучняў па вучэбных прадметах у секцыях “Лінгвістыка (беларуская мова)” і “Літаратуразнаўства (беларуская літаратура)” штогадова, пачынаючы з 2017 года, для Гомельскай вобласці з’яўляецца выніковым. Мы маем пераможцаў

дзякуючы крапатлівай сістэмнай працы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гімназіі №51 г.Гомеля: Кірушкінай Марыі Іванаўны і Афанасьевай Наталлі Васільеўны, Крэч Таццяны Сяргееўны з Акцябрскай гімназіі, Дарошка Таццяны Іванаўны, настаўніка 6-й школы Светлагорска і Дземішкан Вольгі Ігараўны, настаўніка 10-й школы Светлагорска.

Адбор удзельнікаў на рэспубліканскі конкурс работ даследчага характару адбываецца па выніках абласной навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў па прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных накірунках “Пошук”.




Выніковым на працягу сямі гадоў у секцы ”Лінгвістыка” быў удзел у канферэнцыі юных даследчыкаў з Савецкага раёна, шасці апошніх гадоў – Светлагорскага раёна, тройчы – Акцябрскага і Жыткавіцкага раёнаў, двойчы – Ельскага, Калінкавіцкага, Жлобінскага, Рагачоўскага, Чачэрскага раёнаў, Цэнтральнага раёна г.Гомеля. Прадстаўнікі астатніх раёнаў перамагалі толькі аднойчы.




У секцыі “Літаратуразнаўства” штогадова пераможцамі станавіліся юныя даследчыкі таго ж Савецкага раёна, пяць разоў – Цэнтральнага раёна г.Гомеля, двойчы – Светлагорскага і Жыткавіцкага раёнаў. Прадстаўнікі астатніх раёнаў заваёўвалі перамогу толькі аднойчы.

Ні разу за 7 гадоў ні ў адной з секцый не змаглі атрымаць дыплом пераможцы прадстаўнікі Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага раёнаў, устаноў падпарадкавання

упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, абласных ліцэяў, ліцэя Міністэрства надзвычайных справаў, Гомельскага кадэцкага вучылішча. Як правіла, іх работы насілі рэфератыўны характар, не адказвалі патрабаванням да афармлення вынікаў даследавання, мелі невысокі ўзровень унікальнасці работ (да 50%), мелі неактуальную тэматыку, на адпавядалі патрабаванням парадку работы секцыі Палажэння аб Гомельскай абласной навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў па прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных накірунках “Пошук”.

Пры падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару кансультатыўную дапамогу аказваюць супрацоўнікі ГАІРА і выкладчыкі ўніверсітэта імя Ф.Скарыны. Паэтапна праводзяцца трэніровачныя зборы па падрыхтоўцы да конкурсу. Гэта заўсёды прыносіць свае вынікі. Такая мадэль падрыхтоўкі вучняў можа быць выкарыстана ў раёнах пры падрыхтоўцы да абласной канферэнцыі “Пошук”. Звяртаем увагу на неабходнасць адбору работ строга ў адпаведнасці з парадкам работы секцый ”Лінгвістыка” ці “Літаратуразнаўства”, размешчаных у якасці дадатка да палажэння аб канферэнцыі. Неабходна прыцягваць да адбору работ настаўнікаў, якія маюць вопыт удзелу ў рэспубліканскім конкурсе даследчых работ, ці неаднарозова рыхтавалі пераможцаў абласной канферэнцыі “Пошук”. Для павышэння якасці падрыхтоўкі вучняў да даследчых конкурсаў запрашаем настаўнікаў наведваць летнюю школу, якая традыцыйна праводзіцца ў жніўні.

Паважаныя калегі! Менавіта ад кожнага з нас залежыць паспяховасць кожнага вучня, выніковасць адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры. Вы з’яўляецеся той кіруючай сілай, якая захапляе, вядзе за сабой, адраджае гонар і самасвядомасць маладога пакалення, прывівае любоў да матчынай мовы.

# Адукацыйная прастора Жлобінскага раёна

*Федарава Алена Леанідаўна,*
*загадчык ДУА "Жлобінскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"*

Па стане на 01.10.2023 года у сістэму адукацыі Жлобінскага раёна ўключаюцца 80 устаноў адукацыі, у тым ліку 34 установы агульнай сярэдняй адукацыі, 39 устаноў дашкольнай адукацыі, 5 устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, сацыяльна-педагагічны цэнтр. Існуючая адукацыйная сетка дазваляе ў поўнай меры ахапіць адукацыяй ўсё дзіцячае насельніцтва раёна і задаволіць існуючыя патрэбы ў развіцці розных здольнасцяў навучэнцаў.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі навучаецца 14021 навучэнцаў, ва ўстановах дашкольнай адукацыі – 4770 выхаванцаў.

Адукацыйны працэс у раёне ажыццяўляюць 2448 педагагічных работнікаў, 67 з іх – настаўнікі беларускай мовы і літаратуры. Колькасць настаўнікаў з вышэйшай і першай катэгорыяй – 65,6%, сярод настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры – 86,6%.

Мэтанакіраваная работа вучэбна-метадычнага кабінета, устаноў адукацыі па павышэнні метадычнага ўзроўню настаўнікаў дае добрыя вынікі. Выкарыстанне эфектыўных форм работы, разнастайных сродкаў навучання, спрыяе развіццю асобасных, метапрадметныя і прадметных навыкаў навучэнцаў, што, безумоўна, станоўча адбіваецца на выніковасці навучання.




У скарбонцы Жлобінскага раёна – перамогі вучняў у абласных і рэспубліканскіх алімпіядах, інтэлектуальна-творчых конкурсах, канферэнцыях па вучэбных прадметах: "Гавары са мной па-беларуску" – 2 дыпломы (67% якасці), XX адкрытая канферэнцыя вучэбна-даследчых работ "Мележаўскія чытанні" – 10 дыпломаў (100% якасці), Гран-пры XVII абласнога конкурсу чытальнікаў "Захаваем свет разам!" і іншыя.

У 2022/2023 навучальным годзе на трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах навучэнцы Жлобінскага раёна заваявалі 48 дыпломаў, з іх 6 па беларускай мове і літаратуры (7 удзельнікаў); дыпломы II і III ступені на заключным этапе алімпіяды.

Па выніках трэцяга этапу абласной алімпіяды вучні Жлобінскага раёна атрымалі 53 дыпломы, 6 з іх па беларускай мове (15 удзельнікаў).

Па выніках цэнтралізаванага экзамену 2023 года у абласным рэйтынгу Жлобінскі раён займае трэцюю пазіцыю з вынікам 65,57 балаў (сярэднеабласны 62,35). Па беларускай мове сярэдні бал – 69,60 пры сярэднеабласным 64,60. На працягу сямі гадоў Жлобінскі раён уваходзіў у тройку лідараў па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Выдатны старт быў і на цэнтралізаваным

экзамене. Высокія вынікі навучэнцаў – гэта следства высокага прафесійнага ўзроўню настаўнікаў Жлобішчыны.

Несумненна, інфармацыйныя рэсурсы, матэрыяльна-тэхнічная база спрыяюць дасягненням навучэнцаў і настаўнікаў, але рух наперад будзе запаволены без правільна арганізаванай метадычнай работы, першачарговай задачай якой з'яўляецца ўцягванне кожнага педагога ў дзейнасць па павышэнню свайго прафесійнага ўзроўню. Бо якасць адукацыі не можа быць вышэй за якасць працуючых у ёй педагагічных работнікаў і залежыць ад узроўню прафесіяналізму і кампетэнтнасці, гатоўнасці да вырашэння прафесійных задач, рэалізацыі педагагічнай дзейнасці. Метадычная сетка раёна прадстаўлена 82 метадычнымі фарміраваннямі, у якую ўвайшлі:

38 раённых метадычных, вучэбна-метадычных аб'яднанні,

12 творчых груп,

6 праблемных груп,

15 школ маладога спецыяліста,

2 школы ўдасканалення педмастерства,

3 школы эфектыўнага педагагічнага вопыту,

6 пастаянна дзеючых семінараў.

Вызначана 12 апорных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі па шэрагу напрамкаў дзейнасці (арганізацыя работы па падрыхтоўцы вучняў да алімпіяд па вучэбных прадметах, па розных напрамках выхаваўчай работы і інш.). Створана 8 раённых рэсурсных цэнтраў (4 на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі). Дадзеная метадычная сетка дазваляе ахапіць усіх педагогаў раёна і эфектыўна арганізаваць працу з імі.



Важным крытэрыем эфектыўнасці работы і высокага ўзроўню прафесіяналізму педагагічных работнікаў з'яўляецца іх удзел у конкурсах прафесійнага майстэрства, трансляцыя вопыту праз сродкі масавай інфармацыі, на семінарах, павышэнні кваліфікацыі, так як ствараецца спрыяльнае матывацыйнае асяроддзе для прафесійнага развіцця педагогаў, распаўсюджвання інавацыйнага вопыту, што спрыяе прафесійнаму самавызначэнню, развіццю актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Больш за 100 матэрыялаў апублікавана педагагічнымі работнікамі Жлобінскага раёна ў 2022/2023 навучальным годзе ў сродках масавай інфармацыі, у зборніках навукова-практычных канферэнцый абласнога, рэспубліканскага, міжнароднага ўзроўняў, на сайтах абласнога, рэспубліканскага метадычных, педагагічных парталаў; 27 педагагічных работнікаў транслявалі свой вопыт у рамках павышэння кваліфікацыі ў дзяржаўнай установе адукацыі "Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі", больш за 70 педагагічных работнікаў транслявалі свой вопыт у рамках абласных, рэспубліканскіх семінараў.

**Фрагмент урока беларускай мовы ў V класе**
**па тэме “Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова)”**

*Лебедзева Наталля Сяргееўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна”*

**Задачы ўрока:**

актуалізаваць і паглыбіць веды вучняў пра тыпы маўлення, іх прыметы;

паказаць асаблівасці будовы кожнага з тыпаў маўлення;

дапамагчы вучням усвядоміць залежнасць тыпу маўлення ад тэмы і мэты выказвання;

выпрацоўваць уменні вызначаць тып розных па змесце і будове тэкстаў, адзначаць узаемасувязь паміж зместам і тыпам маўлення, называць лагічныя часткі.

**Абсталяванне:** падручнік, каляровыя алоўкі.

**Дыдактычныя матэрыялы:** маршрутны аркуш “Тыпы маўлення”, прэзентацыя, наглядны матэрыял.

**Ход фрагмента ўрока**

**Этап актуалізацыя ведаў вучняў**

Прыём “Кошык ідэй”.

**Заданне**. *Працуючы ў парах, выбраць з прапанаваных паняццяў і тэрмінаў тыя, што з’яўляюцца прыметамі тэксту, і аргументаваць свой выбар.*

**Слова на дошцы**: тэматычнае адзінства, загаловак, звязнасць, паслядоўнасць, будова, склон, скланенне, спражэнне.

**Этап аперацыйна-пазнавальны**

Работа з тэкстамі.

**Заданне.** *Прачытаць сказы. Дакажыце, што яны з'яўляюцца тэкстамі. Адкажыце на пытанні да тэкстаў. Абазначце межы частак тэксту-апавядання, тэксту-апісання, тэксту-разважання. Чым аб’яднаны і чым адрозніваюцца дадзеныя тэксты?*

**1.** Сеў за кола ганчар. З гліны выкруціў шар.
Горла. Вушка прырабіў. Усё ў печы абпаліў.
І глядзіце: ужо гатовы залаты гаршчочак новы.

**2.** Над ганчарным кругам сядзеў стары.

Без шапкі, у шэрай расхрыстанай кашулі. Белы маршчыністы лоб быў шчодра акроплены потам. Сівыя валасы зноў растрэсліся.

А старыя спрацаваныя рукі зладжана фармавалі свой новы цуд.

**3.** Ганчар не любіць вырабляць посуд для таго, каб той стаяў.

Чаму? Кожны майстар жадае, каб яго вырабы служылі чалавеку штодзень, уносілі ў яго жыццё карысць і асалоду.

Таму людзі і шануюць працу ганчара.

Гутарка па пытаннях да тэкстаў:

– Пра людзей якой прафесіі гаворыцца ў тэкстах?

– Якія прылады працы патрэбны ганчару для работы?

– Ці сустракаліся вы ў сваім жыцці з вырабамі сучасных ганчароў?

*Настаўнік дэманструе вучням два гаршчкі – старажытны (экспанат музея) і зроблены сучаснымі майстрамі.*

– Звярніце ўвагу на слайд і падкажыце, дзе мы можам сустрэць старажытны гаршчок?



Праца з маршрутным аркушам.

– Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстамі? Абгрунтуйце, калі ласка, сваю думку, выкарыстоўваючы тую інфармацыю пра тэкст, якую вы пакінулі ў кошыку ідэй.

– Прапануйце назвы для гэтых тэкстаў (па радах).

– Скажыце, калі ласка, што *агульнае* ў гэтых тэкстах?

– Чым *адрозніваюцца* тэксты?

2. Прыём “ Воблака слоў”.

Заданне. *Вызначыць назвы тыпаў маўлення, карыстаючыся інфармацыяй з воблака слоў (апавяданне, разважанне, апісанне, казка, пераказ, сачыненне, верш, гісторыя).*




3. Прыём “Табліца з белымі плямамі”.

Заданне. *Пастаўіць пытанні да тэкстаў розных тыпаў маўлення? Запісаць іх у табліцу. Самаправерка па схеме з практыкавання 110 падручніка.*

| **Тып тэксту** | **Апавяданне** | **Апісанне** | **Разважанне** |
|---|---|---|---|
| На якое пытанне адказвае? | ... | ... | ... |
| Будова тэксту | Развіццё дзеяння | Агульнае ўяўленне аб прадмеце | Вывад, да якога прыходзіць аўтар |
| | Пачатак дзеяння | Пералік яго характэрных прымет | Доказы думкі |
| | Заканчэнне дзеяння | Ацэнка прадмета, адносіны да яго | Думка, якая даказваецца |

4. Работа з табліцай.

Знаёмства з асаблівасцямі будовы тэкстаў.

Заданне. Вызначце, з якіх частак складаецца тэкст і як яны называюцца. Звярніце ўвагу на частку табліцы "Будова тэксту". Устанавіце правільную паслядоўнасць частак тэксту-апавядання, пазначыўшы іх лічбамі 1, 2, 3. Прачытайце тэкст-апавяданне (тэкст 1), назавіце кожную частку ў гэтым тэксце.

Устанавіце правільную паслядоўнасць частак тэксту-апісання, пазначце іх лічбамі. Прачытайце тэкст-апісанне, назавіце кожную частку ў гэтым тэксце. Знайдзіце частку "Ацэнка прадмета, адносіны да яго". Пазначце яе чырвоным колерам.

**Этап трэніровачна-карэкцыйны**

Устанавіце паслядоўнасць частак тэксту-разважання, пазначце іх адпаведнымі колерамі (тэкст III з маршрутнага аркуша). Назавіце і прачытайце кожную частку тэксту.

| Тып тэксту | Апавяданне | Апісанне | Разважанне |
|---|---|---|---|
| На якое пытанне адказвае? | … | … | … |
| Будова тэксту | 2. Развіццё дзеяння | 1. Агульнае ўяўленне аб прадмеце | 3. Вывад, да якога прыходзіць аўтар |
| | 1. Пачатак дзеяння | 2. Пералік яго характэрных прымет | 2. Доказы думкі |
| | 3. Заканчэнне дзеяння | 3. Ацэнка прадмета, адносіны да яго | 1. Думка, якая даказваецца |

**Фрагмент урока беларускай літаратуры ў IX класе**
**па тэме "Мікола Гусоўскі. "Песня пра зубра". Тэма Радзімы ў творы"**

*Астапенка Ірына Генадзьеўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА "Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна"*

**Мэта :** асэнсаванне ідэйна-мастацкага зместу паэмы "Песня пра зубра".

**Задачы:**

засяродзіць увагу на вобразнай сістэме твора (вобразы Радзімы, аўтара, зубра, Вітаўта);

раскрыць сімвалічнае значэнне вобраза зубра;

шляхам асэнсавання аўтарскай пазіцыі раскрыць паняцце *гуманізму ў літаратуры*;

выпрацоўваць навыкі даваць аргументаваныя адказы на праблемныя пытанні;

спрыяць узбагачэнню лексікі вучняў, фарміраванню грамадзянска-патрыятычных каштоўнасных арыентацый.

**Абсталяванне:** падручнік, тэкст твора, аўдыязапіс.

**Дыдактычныя матэрыялы:** табліца-канструктар, прэзентацыя.

## Ход фрагмента ўрока

**Этап аперацыйна-пазнавальны**

Прыём “Ключавое пытанне”. *(Настаўнік прапануе паразважаць над пытаннем на працягу ўрока)*

– Якія асаблівасці паэмы дазволілі назваць яе гімнам роднай зямлі?

Задача: стварыць умовы для асэнсавання ідэйна-мастацкага зместу твора.

Лексічная работа: тлумачэнне лексічнага значэння слова гімн.

Гімн – урачыстая песня, прынятая як сімвал дзяржаўнага адзінства.

Пытанне да вучняў:

– Ці можам мы паставіць знак роўнасці паміж паняццямі “Радзіма” і “дзяржава”? Абгрунтуйце сваю думку.

Прыём “Супастаўленне”.

Задача: выяўленне агульнай пазіцыі аўтараў у дачыненні да Радзімы, да паняцця “патрыятызм”.

Зварот да прадмовы “Юдзіф” Францыска Скарыны.

**Заданне**:

– Прачытайце тэкст твора. Успомніце, як называецца твор і хто з’яўляецца аўтарам гэтых радкоў?

– Што аб’ядноўвае паэму Міколы Гусоўскага з гэтым творам?

Прыём “Дэнататны граф”.

**Задача**: фарміраваць уменні здабываць неабходную інфармацыю, інтэпрэтаваць і ацэньваць атрыманыя веды.

**Заданне**: на аснове тэксту дапоўніце табліцу патрэбнай інфармацыяй:




Прыём “Белыя плямы”.

Задача: аднавіць азначэнне паняцця “сімвал”.

Заданне: Запоўніце прабел у азначэнні:

__________________– гэта ўмоўнае абазначэнне, знак якога- небудзь прадмета, з'явы, ідэі.



– Што сімвалізуюць выявы на слайдзе?

Настаўнік: Сімвалы Беларусі сучасныя і старажытныя.

Прыём "Табліца-канструктар".

Задача: сістэматызаваць веды пра сімвалічнае значэнне вобраза зубра ў паэме, абапіраючыся на змест паэмы.

**Заданне**: размясціць элементы табліцы на патрэбныя месцы.

| Вобразы | Цытаты з твора | Агульныя рысы з зубром |
|---|---|---|
| Народ | | |
| Радзіма | | |
| Вітаўт | | |

Настаўнік. Падагульненне.

Роля зубра ў творы як збіральнага вобраза-сімвала.

Слова настаўніка пра унікальнасць жывёлы, знішчэнне зуброў, занясенне ў Чырвоную кнігу.

Праца з тэкстам.

Выразнае чытанне ўрыўка вучнем.

**Задача**: стварэнне ўмовы для ўсведамлення вучнямі пазіцыі аўтара ў дачыненні да смерці жывёлы; асэнсаваць аўтарскую пазіцыю.

– Як вы лічыце, якімі рысамі характару ад нараджэння мог быць надзелены М.Гусоўскі? (дабрыня, спачуванне, любоў, міларнасць….). Абгрунтуйце сваю думку.

Лексічная работа з паняццем "гуманізм", стар. 38.

**Задача**: стварыць умовы для асэнсавання вучнямі паняцця "гуманізм у літаратуры".

– Якую каштоўнасць ставяць на першае месца гуманісты? Пры якіх абставінах парушаюцца гуманныя адносіны да чалавека?

– На якія каштоўнасныя арыентацыі звяртае ўвагу паэт у паэме? Якія з іх можна выдзеліць для свайго асабістага жыцця?

Прыём "ПАПВ".

**Задача**: вызначэнне ідэйна-мастацкага зместу паэмы "Песня пра зубра".

Заданне: даць адказ на ключавое пытанне ўрока: *Якія асаблівасці паэмы дазволілі назваць яе гімнам роднай зямлі?* Адказ афарміць ў выглядзе ПАПВ-формулы з выкарыстаннем клішэ:

**П** – пазіцыя (выкажыце сваё меркаванне):

*Я лічу, што... (На мой погляд,.., Я згодны (ая) з …)*

**А** – абгрунтаванне (аргументуйце сваю пазіцыю):

Таму што гімн …

**П** – прыклады (прывядзіце не менш за 3 факты, прыклады для ілюстрацыі):

(*Я магу давесці гэта на прыкладзе*… Вось мае прыклады… *Я так думаю*, таму што…)

**В** – выснова (меркаванне, што пацвярджае пазіцыю):

Такім чынам, … (У выніку… Таму… Я раблю выснову, што… Я лічу, што…)

Заключнае слова настаўніка.

## Майстар-клас “Выкарыстанне рабочага ліста як спосаб арганізацыі дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы”

*Жгарова Валянціна Мікалаеўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Камунараўская сярэдняя школа*
*Буда-Кашалёўскага раёна”*

**Мэта:** праз арганізацыю актыўнага ўзаемадзеяння стварыць умовы для павышэння прафесійнага майстэрства педагогаў.

**Задачы:**

прадэманстраваць ролю рабочых лістоў у працэсе арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы;

арганізаваць узаемадзеянне ўдзельнікаў;

садзейнічаць засваенню прынцыпаў арганізацыі ўрока, на якім выкарыстоўваюцца рабочыя лісты;

прадэманстраваць практычную значнасць вопыту.

**Абсталяванне**: мультымедыйная прэзентацыя, карткі з заданнямі, лісты для запісаў, рэфлексійная картка .

### Ход майстар-класа

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

**1. Прыём “Прапорцыі”.**

Вызначце, якое слова, на вашу думку, павінна быць на месцы пропуску, калі ўлічваць сённяшнія патрабаванні да навучальнага працэсу.

Спецыяліст — майстэрства = вучань — ? (кампетэнцыя)

**2. “Прамое пытанне”.**

*Якія* тры доказы вы можаце прывесці на карысць таго, што гэта сапраўды важная і актуальная тэма, якая патрабуе нашай увагі і разгляду?

**3. Прыём “Так-не”**

Аб’яднаць на адным уроку адпрацоўку і развіццё ўсіх вучнёўскіх кампетэнцый проста?

Кожны вучань на ўроку павінен быць ахоплены увагай настаўніка і забяспечаны работай?

Проста спланаваць такое ўзаемадзеянне настаўніка і вучняў?

Ці займае важнае месца на ўроку самааналіз і самакантроль вучэбнай дзейнасці?

Падрыхтоўка вучняў да розных выпрабаванняў (алімпіяды, ЦЭ і г.д.) займае важнае месца на ўроку.

**II. Этап мэтавызначэння**

Урок, які мае абмежаваны час (40 або 45 хвілін), павінен вырашаць многія пытанні адукацыйнага працэсу. Праграмныя патрабаванні сцвярджаюць: “Навучанне беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і арыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага і сацыякультурнага падыходаў пры выкладанні ўсіх тэм і раздзелаў”. Паспрабуем на сённяшнім майстар-класе вырашыць гэтыя

праблемы, прадэманстраваць, як з дапамогай рабочых лістоў уключыць вучняў у пазнавальную дзейнасць.

**Прыём "Суседзі".** Давайце бліжэй пазнаёміся і падзелімся на групы, якія будуць уключаць "суседзяў" раёнаў Гомельскай вобласці.

**III. Этап інфармацыйна-дзейнасны**

**3.1 Слова майстра**. Ніхто сёння не будзе спрачацца з тым, што працэс засваення ведаў носіць больш прадуктыўны характар тады, калі ён з'уляецца практыка-арыентаваным, калі вучань актыўна ўключаецца ў работу, калі на ўроку створаны ўмовы для актывізацыі яго мыслядзейнасці. Засваенне ведаў і фарміраванне ўменняў і навыкаў навучэнцаў будзе больш паспяховым, калі вучні праяўляюць пазнавальную актыўнасць. Гэта таксама аксіёма, якую не трэба даказваць. Выкарыстанне рабочых лістоў дазваляе арганізаваць урок такім чынам, што ў вучняў ёсць магчымасць праяўляць пазнавальную актыўнасць, замацоўваць тэарэтычны матэрыял, сістэматызаваць веды па вывучаных тэмах і раздзелах. Кожны вучань праз актыўнае ўключэнне ў практычную дзейнасць па выкананні заданняў на рабочых лістах можа забяспечыць асобаснае развіццё.

**3.2. Прыём "Белыя плямы".** Звярніце ўвагу на тэарэтычнае азначэнне паняцця "рабочы ліст". Якіх слоў, на вашу думку, не хапае замест пропускаў.

**Рабочы ліст (РЛ) – гэта ______________ сродак арганізацыі вучняў на _______________________ вучэбную дзейнасць.**

(Рабочы ліст – гэта дыдактычны сродак арганізацыі вучняў на самастойную вучэбную дзейнасць.)

**3.3**. Сапраўды, рабочы ліст – гэта сістэма заданняў па вызначанай тэме ўрока, распрацаваная самім настаўнікам з мэтай арганізацыі вучэбнай дзейнасці ў розных відах. Такі спосаб падачы інфармацыі патрабуе ад вучня засяроджанасці на тэме ўрока і засваення галоўнага. Мэтазгоднасць выкарыстання рабочага ліста абгрунтавана вялікім аб'ёмам інфармацыі, якую вучням неабходна атрымаць і засвоіць на кожным уроку.

Да інструмента «Рабочы ліст» не адносяцца ксеракопіі заданняў з падручніка або дапаможніка; рабочы сшытак; тэсты, адкрытыя пытанні і г.д.

Часцей за ўсё ствараюць рабочыя лісты з выкарыстаннем тэкстаў, малюнкаў, табліц. Ствараючы рабочыя лісты, можна выкарыстоўваць наступныя заданні: *устанаві адпаведнасць; дапоўні; падпішы; злучы; знайдзі; закрэслі* і т.д.

Такая форма РЛ пры арганізацыі вучэбнага працэсу дазваляе пабудаваць логіку засваення новых ведаў (успрыманне– асэнсаванне – запамінанне – прымяненне – абагульненне – рэфлексія).

**3.4 Дыдактычны матэрыял рабочых лістоў. Што ўключаем у РЛ?**

**1) Матэрыялы, накіраваныя на асэнсаванне інфармацыі, дадзенай у падручніку.**

| |
|---|
| 1. Прачытайце практыкаванне 141. Адзначце з прапанаваных адказаў той, з якім вы пагаджаецеся. |
| ○ Вучоба прыносіць задавальненне, калі на ўроках даведваешся пра нешта |

| |
|---|
| новае, цікавае.<br>○ Бачыш вынікі сваёй працы, атрымліваеш добрыя адзнакі.<br>○ Сам навучышся нечаму новаму і дапаможаш таварышу.<br>Звярніце ўвагу на задачы ўрока, змешчаныя ў “воблачку”. |

2. Прачытайце § 18.

3. Запішыце, абапіраючыся на параграф, як называюцца знакі прыпынку, змешчаныя ў табліцы і што выражаюць паводле мэты выказвання.

| Знак | Назва | Што выражаюць? |
|---|---|---|
| • | | |
| ? | | |
| ! | | |

| |
|---|
| 1. Прачытайце тэарэтычны матэрыял параграфа ___ на с. ___<br>2. Прадоўжыце сказы<br>А) адасобленыя акалічнасці часцей за ўсё ў сказе абазначаюць_________________ і паясняюць_______________________<br>Б) адасобленыя акалічнасці выражаюцца __________________________<br>В) адасобленыя акалічнасці ў пачатку і ў сярэдзіне сказа вымаўляюцца ____________________________________________________________________<br>Г) асноўны знак прыпынку пры адасобленых акалічнасцях ____________________________________________________________________ |

| |
|---|
| 1. Разгарні стар. ________падручніка і ўспомні асноўныя сінтаксічныя паняцці, якія трэба было засвоіць у 8 класе.<br><br>Гледзячы ў змест, паспрабуйце дапісаць сказы. Адказы запішыце ў ліст або сшытак.<br>1) Раздзел моваЗнаўства, які вывучае будову словазлучэнняў і сказаў, называецца…<br>2) Асноўнымі адзінкамі сінтаксісу з’яўляюцца…<br>3) Сістэма знакаў прыпынку называецца…<br>4) Спалучэнне двух і больш самастойных слоў, звязаных паміж сабой сэнсава і граматычна, называецца…<br>5) У словазлучэннях выдзяляецца тры віды сінтаксічнай сувязі: …, …, … .<br>6) Асноўны сродак выражэння і паведамлення думкі называецца …<br>7) Граматычную аснову сказа складаюць… і …<br>8) Сказ, у якім граматычная аснова складаецца з аднаго галоўнага члена, называецца …<br>9) Па наяўнасці галоўных і даданых членаў сказа сказы бываюць … і …<br>10) Сказы, у якіх адсутнічаюць члены сказа, неабходныя для разумення сэнсу называюцца … |

**2) Заданні, накіраваныя на запамінанне вучэбнага матэрыялу.**

**“Так – не”.** Праверка разумення тэарэтычнага матэрыялу. Адзначце любым знакам, вы згодны ці не згодны са сцвярджэннем.

| Пытанне | Так | Не |
|---|---|---|
| 1. Сказ, у якім сэнсава-граматычныя часткі звязаны паміж сабой з дапамогай злучальных злучнікаў, называецца складаназалежным? | | |

| | | |
|---|---|---|
| 2. У складаназалежным сказе сэнсава-граматычныя часткі адносна раўнапраўныя, незалежныя адна ад другой. | | |
| 3. Частка, ад якой ставіцца пытанне, называецца галоўнай. | | |
| 4. Даданая частка складаназалежнага сказа заўсёды знаходзіцца пасля галоўнай. | | |
| 5. Даданая дапаўняльная частка ў складаназалежных сказах адказвае на пытанні ўскосных склонаў. | | |
| 6. Від даданай часткі залежыць ад яе пазіцыі адносна галоўнай. | | |
| 7. Даданая дапаўняльная частка можа паясняць толькі выказнік у галоўнай частцы. | | |
| 8. Сродкамі сувязі ў складаназалежных сказах з даданай дапаўняльнай часткай выступаюць толькі падпарадкавальныя злучнікі. | | |
| 9. Часцей за ўсе складаназалежныя сказы выкарыстоўваюцца ў гутарковым стылі. | | |

| Сцвярджэнне | Веру | Не веру | Правільны варыянт |
|---|---|---|---|
| Фанетыкай называецца раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца літары. | | | |
| Напісанне слоў не заўсёды адпавядае іх вымаўленню. | | | |
| У беларускай мове 7 галосных гукаў. | | | |
| Звонкімі называюцца зычныя гукі, якія ўтвараюцца з шуму пры ўдзеле голасу. | | | |
| Гукі [ж] , [ш ], [дж ], [ч ] - шыпячыя. | | | |
| Гук [й] можа быць цвёрдым і мяккім. | | | |

Прачытайце, устаўце прапушчаныя літары. Абапіраючыся на інфармацыю падручніка, дапішыце сказы.

1. Раз__ел навукі аб мове, у якім вывучаю___а гукі мовы гэта_____________________________________________________________________

2. Раз__ел навукі аб мове, у якім вывучаю___а правілы выма__лення гукаў і іх спалучэнняў – гэта _________________________________________________

3. Усе літары адной мовы, якія размешчаны ў пэ__ным пара__ку – ________ ______________________________________________________________________

4. Раз__ел навукі аб мове, у якім вывучаю___а правілы напісання літар – гэта ______________________________________________________________

5. У беларускай мове ___ літары і ___ гукаў. Усе літары падзяляюцца на ________________ і _______________________. Для абазнач__ння гукаў выкарысто__ваюцца ______________________________________________.

### 3) Заданні, накіраваныя на прымяненне ведаў у знаёмай і незнаёмай сітуацыі.

*З гукавога запісу зрабіце арфаграфічны, словы запішыце ў алфавітным парадку і падзяліце іх на склады.*

| |
|---|
| [йакас’ц’], [кв’этка], [л’ал’ка], [арыйа], [ал’эйа], [дз’эн’], [в’эс’алос’ц’], [м’ац’эл’іца] [п’эрамога], [школ’н’ік].<br>__________________________________________________________________<br>____________________________________________________________ |

Прачытайце сказы. Устанавіце адпаведнасць паміж схемамі і сказамі. У сказах пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Дзе трэба, малую літару выпраўляйце на вялікую.

| | |
|---|---|
| А. Капітан карабля спытаў Алёша ты ў якім класе вучышся | 1. “П!”— а. |
| Б. Я пяць баравікоў знайшоў крыкнуў Юрка | 2. “П,”— а. |
| В. Што такое шчасце пытаеш ты | 3. А: “П?” |
| Г. Нікога няма дома сказаў хлопчык | 4. “П?”— а. |

А__Б__В__Г__

**4) Заданні, накіраваныя на абагульненне ведаў.**

*Закрэсліце спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі. У словазлучэннях абазначце галоўнае і залежнае словы. Пад дзеяслоўнымі пастаўце* ***дз.****, пад назоўнікавымі* ***наз****.*

Позняя восень, праз лес, блакітнае неба, чытаць кнігу, люблю край, я вучуся, узыход сонца, апошні ліст, вецер дзьмуў, дзьмуў з поўначы, хадзіць і назіраць, на лясной паляне, хадзіць па лесе, наступіла восень, любуюся восенню.

*Злучыце першую (А) і другую (Б) часткі сказаў, каб атрымаліся вершаваныя радкі. У сказах устаўце прапушчаныя літары і пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.*

А) 1. Ужо в..сеньскія фарбы разліліся па ўсёй з..млі…
2. Дуб-крапак і куст малы стаяць у мудрым задуменні…
- Зрывае в..сень з др..ў лісты і сцеле, сцеле іх н..спешна…
- Зарастаю..ь сл..ды самага до..гага веку…
- Рабіна на..ела каралі і стала ля самай дарогі...
- Асеннімі днямі чырванее рабіна…

Б) а) …а жыве праз гады толькі след чалавека.
б)…і вось ужо дыван шапоча пад нагамі залаты.
в)…і просяцца з купіны ў вярэньку журавіны.
г)…а сосны сача..ь і струменя..ь густы, духмяны пах смалы.
д)… і пратрубілі ростань у сумным небе жура..лі.
е)…а пыхлівыя кл..ны кідаюць ёй золата ліс..я пад ногі.

Адказ: 1__2__3__4__5__ 6__

| | |
|---|---|
| 1. | 4. |
| 2. | 5. |
| 3. | 6. |

*Прачытайце словазлучэнні, устаўце прапушчаныя літары. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх значэннем*

| | |
|---|---|
| А. Смачны ***гас__інец*** – ш__рокі ***гас__інец*** | 1. Мнагазначныя словы |

| | |
|---|---|
| Б. ***Ід__я*** твора – падаць ***ід__ю*** | 2. Сінонімы |
| В. ***Балотная*** расліна – ***бало__істы*** бераг | 3. Антонімы |
| Г. ***Родны*** край – ***чужая*** старана | 4. Паронімы |
| Д. ***Неа__кладная*** работа – ***т__рміновае*** заданне | 5. Амонімы |

Адказ: А__Б__В__Г__Д__

**5) Рэфлексія.** Рэфлексія дазваляе падтрымліваць увагу да матэрыялу, фарміраваць навыкі самастойнага засваення інфармацыі і асэнсоўваць сваю работу.

**“Закончы сказ…”,**
“Сёння я даведаўся (даведалася)…”
“Было цікава…”
“Было цяжка…”
“У мяне атрымалася…”
“Я змог (змагла)…”,
“Мяне здзівіла…” і інш.

**Ацаніце сваю работу**. Падкрэсліце словы, якія адпавядаюць вашаму стану

| | | |
|---|---|---|
| На ўроку я працаваў(ла)… | Актыўна | Пасіўна |
| Сваёй работай я… | задаволены(а) | незадаволены(а) |
| За ўрок я… | стаміўся(лася) | не стаміўся(лася) |
| Мой настрой | не змяніўся | Палепшыўся |
| Матэрыял урока для мяне | цікавы і зразумелы | незразумелы і нецікавы |
| Дамашняе заданне мне здаецца | простым і лёгкім | цяжкім і складаным |

Прыём **“Плюс – мінус – цікава”**: у графу “плюс” запісваецца ўсё, што спадабалася, у графу “мінус” – тое, што было нецікавым ці непатрэбным, у графу “цікава” – новае і незвычайнае на ўроку.

Галоўнай умовай выкарыстання рабочага ліста з'яўляецца задача вучыць вучня вучыцца і паказваць яму, што сам працэс навучання можа быць цікавым і, калі вучань прыкладае некаторыя намаганні, то ён не толькі атрымлівае вынік, але і адчувае задавальненне ад працэсу навучання, бо ёсць разуменне асабістых поспехаў.

Заданні ў рабочым лісце складаюцца па прынцыпе “ад простага да складанага”, “ад агульнага да прыватнага”.

Праца з лістамі можа быць не толькі індывідуальнай, але і парнай або групавой, што садзейнічае сацыялізацыі вучняў, фарміруе і ўдасканальвае камунікатыўныя кампетэнцыі школьнікаў.

Да пераваг выкарыстання рабочага ліста ў навучальным працэсе можна аднесці наступнае:

выкарыстанне рабочага ліста садзейнічае развіццю прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў;

ёсць магчымасць уключаць заданні больш высокага ўзроўню складанасці, накіраваныя на развіццё ўменняў аналізаваць, параўноўваць, прымяняць веды ў новых сітуацыях, знаходзіць інфармацыю ў дадатковых крыніцах і г.д.;

інфармацыя можа быць прадстаўлена ў розных відах (схемы, табліцы, малюнкі, тэксты, дыяграмы і г.д.);

настаўнік мае магчымасць ацаніць, як кожны від работы асобна, так і выкананне рабочага ліста ў цэлым, бачыць прабелы ў вывучэнні тэмы, уносіць карэкціроўкі ў адукацыйны працэс;

выкарыстанне рабочых лістоў на ўроках і аналіз іх выканання дазваляе адсочваць асобасны рост кожнага вучня і яго імкненне да самаразвіцця;

настаўнік становіцца кансультантам, каардынатарам і назіральнікам, у той час як вучні – даследчыкамі і супрацоўнікамі.

Такім чынам, рабочы ліст, які з'яўляецца сродкам фарміравання ўменняў працаваць з інфармацыяй, дазваляе арганізаваць прадуктыўную самастойную работу вучняў. Самастойная работа вучняў з вучэбным матэрыялам з'яўляецца важным спосабам атрымання зваротнай сувязі. Акрамя гэтага, выкананне прапанаваных заданняў па рабоце з інфармацыяй фарміруе і развівае розныя групы ўніверсальных вучэбных дзеянняў, дазваляе зрабіць працэс навучання асобасна значным.

Урок з выкарыстаннем рабочага ліста арганізаваны такім чынам, што вучні 40-45 хвілін працуюць па прынцыпе “ведаць, каб умець і дзейнічаць”. У гэтым і заключаецца кампетэнтнасны падыход.

РЛ можна выкарыстоўваць як для арганізацыі вучэбнай дзейнасці, так і для дамашняй работы. У выпадку з выкарыстаннем рабочых лістоў як дамашняй работы выдатна падыходзяць інтэрактыўныя рабочыя лісты. Для арганізацыі такой работы можна выкарыстаць напрацоўкі калег па спасылцы https://razmowa.blogspot.com, раздзел “Інтэрактыўныя рабочыя лісты”

**V. Практычны этап (работа ў групах).** Выкарыстоўваючы матэрыялы (карткі), якія знаходзяцца ў канверце, стварыце РЛ па тэме “Рабочы ліст як спосаб арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў”. Пры складанні РЛ улічвайце, што заданні павінны размяшчацца ад простага да складанага. ( Удзельнікі майстар-класа працуюць у групе, агучваюць свае напрацоўкі)

**IV. Рэфлексійны этап.**

Пытанні рэфлексійнай карткі.

| Ацэнка / Крытэрыі ацэнкі | **2** | **1** | **0** |
|---|---|---|---|
| Ці садзейнічае выкарыстанне РЛ развіццю прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў? | | | |
| Ці можна сцвярджаць, што на ўроку з выкарыстаннем РЛ працуе прынцып “Ведаю, каб умець і правільна дзейнічаць”? | | | |
| Ці рацыянальна арганізавана вучэбная дзейнасць на ўроку з выкарыстаннем РЛ? | | | |
| Камфортна ці дыскамфортна адчуваюць сябе вучні на ўроку з выкарыстаннем РЛ? | | | |
| Ці створаны на ўроку з выкарыстаннем РЛ умовы для асобаснага развіцця вучняў? | | | |

Знаёмства з парадамі па арганізацыі ўрокаў з выкарыстаннем рабочых лістоў і фарміраванні асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый.

**Парады па стварэнні рабочых лістоў да ўрокаў беларускай мовы**

Практыкаванні на веданне правіла сумяшчайце з заданнямі на кемлівасць, знаходлівасць, логіку, эрудыцыю.

Усе заданні ўключайце у цікавы кантэкст.

Заданні павінны быць разнапланавымі.

На пачатку ўрока вучні павінны ведаць аб’ём заданняў, этапаў, якія яны павінны прайсці.

Дапамога настаўніка на ўроку не прадугледжваецца, вучні павінны дзейнічаць самастойна.

Пры цяжкасцях можна выкарыстоўваць падказкі або дапамогу настаўніка.

У рабочым лісце абавязкова трэба прадугледзець арганізацыю самакантролю, які садзейнічае выхаванню самастойнасці і адказнасці.

**Парады па фарміраванні**
**асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый вучняў**

Падбірайце заданні з элементамі навізны і непрадказальнасці, што будзе садзейнічаць фарміраванню ўнутранай цікавасці ў працэсе іх выканання.

Выкарыстоўвайце ў рабоце прыказкі, прымаўкі, цытаты, якія дапамогуць павысіць актыўнасць і матывацыю вучняў на розных этапах урока.

Сачыце за тым, каб навучальныя заданні не толькі адпавядалі ўзроставым абмежаванням, але і мелі ўзровень аптымальнай складанасці, садзейнічалі праяўленню майстэрства і кампетэнтнасці вучня. Рэгулюйце ўзровень складанасці заданняў, павышаючы яго з кожным разам.

Прадастаўляйце вучню права выбару навучальнай задачы, не абмяжоўваючы пры гэтым яго свабоды.

Не стрымлівайце ініцыятыву вучняў і не рабіце за іх тое, што яны могуць рабіць самастойна.

Прывучайце вучняў адсочваць міжпрадметныя сувязі, выкарыстоўваць веды, атрыманыя пры вывучэнні іншых прадметаў.

Не займайцеся павучаннямі, дапамагайце вучням дзейнічаць незалежна, не давайце адназначных інструкцый адносна таго, чым яны павінны займацца.

Прывучайце вучняў да самастойнага вырашэння праблем, даследавання і аналізу сітуацыі.

Даследуйце складаныя сітуацыі, якія ўзніклі ў вучняў пры выкананні заданняў.

Дапамагайце вучыцца кіраваць працэсам засваення ведаў.

Падыходзьце да ўсяго творча.

## Майстар-клас “Кампетэнтнасна арыентаваныя заданні – інструмент урока беларускай літаратуры па развіцці камунікацыі”

*Есіс Яўген Валер’евіч,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Сярэдняя школа№ 16 г. Мазыра”*

**Мэта:** удасканаленне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў у выкарыстанні кампетэнтнасна арыентаваных заданняў (КАЗ) на ўроках беларускай літаратуры з мэтай павышэння эфектыўнасці адукацыйнага працэск.

**Задачы:**

фарміраваць у ўдзельнікаў сістэмны погляд на існасць КАЗ, іх выкарыстанне ў адукацыйным працэсе;

трансліраваць вопыт па фарміраванні асноў індывідуальнай пазнавальнай дзйнасці праз выкарыстанне КАЗ;

стварыць умовы для самарэалізацыі ўдзельнікаў сродкамі КАЗ.

**Абсталяванне:** рэпрадукцыі карцін “Слуцкія паясы” М. Апіёнка, “Слуцкія ткачыхі” А. Панцюка-Жукоўскага, “Слуцкія ткачыхі” Р. Сітніцы, “Слуцкія ткачыхі” В. Хмялеўскага; запіс песні “Слуцкія ткачыхі” (сл. М. Багдановіча, муз. У. Мулявіна) у выкананні В. Дайнекі; відэазапіс з начыткай верша “Слуцкія ткачыхі”, раздатачны матэрыял.

### Ход майстар-класа

*Удзельнікі майстар-класа падзяляюцца на тры групы, выбіраючы перад уваходам адну з трох рэпрадукцый карцін “Слуцкія паясы” М. Апіёнка, “Слуцкія ткачыхі” Р. Сітніцы, “Слуцкія ткачыхі” В. Хмялеўскага, садзяцца ў пазначаную творам жывапісу групу.*

**І. Арганізацыйны этап**

Прывітанне ўдзельнікаў майстар-класа.

**ІІ. Пазнавальны этап.**

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу скіроўвае сучасны адукацыйны працэс з пераважнай трансляцыі гатовых ведаў на стварэнне ўмоў для авалодання вучнямі ключавымі кампетэнцыямі.

Праграма вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” заснавана на ідэях кампетэнтнаснага падыходу. Ва ўмовах развіцця функцыянаванай пісьменнасці ў вучняў павінны сфарміравацца ключавыя кампетэнцыі: літаратурнай, каштоўнасна-светапогляднай, маўленчай, камунікатыўнай, культуратворчай.

Рэалізацыя такога падыходу атрабуе ад настаўніка ўвядзення крэатыўных і эфектыўных сродкаў, сярод якіх – кампетэнтнасна арыентаваныя заданні (КАЗ).

***Прыём “Лесвіца ведаў”.***

<u>**Заданне**.</u> На дошцы прымацаваны плакат з намаляванымі прыступкамі лесвіцы з надпісамі, прымацуйце магніт сіняга колеру на абранай вамі прыступцы.

выкарыстоўваю КАЗ

ведаю пра КАЗ, спрабаваў выкарыстоўваць

| |
|---|
| нешта чуў пра КАЗ, але сам не выкарыстоўваў |
| сустракаюся з КАЗ упершыню |

**III. Мэтавызначэнне *(прыём “Выбар”).***

**<u>Заданне</u>.** Выберыце не больш за тры доказы, якія стасуюцца з вашымі чаканнямі ад плануемага майстар-класа:

| | |
|---|---|
| 1 | Пазнаёміцца з КАЗ, якія спрыяюць развіццю ключавых кампетэнцый |
| 2 | Пазнаёміцца са структурай КАЗ |
| 3 | Даведацца на якіх этапах урока мэтанакіравана выкарыстоўваць КАЗ |
| 4 | Навучыцца самастойна / калектыўна складаць КАЗ |
| 5 | З карысцю для сябе правесці час |

**IV. Інфармацыйна-практычны этап**

Як паказвае практыка, адным з эфектыўных спасобаў развіцця фунцыянальнай пісьменнасці з’яўляецца КАЗ, якое базіруюцца на ведах і ўменнях, і патрабуе уменняў выкарыстоўваць набытыя веды ў практычннай дзейнасці.

***Прыём “Бліц-апытванне”.***

**<u>Заданне</u>.** Прачытайце ўважліва сказы, размяркуйце іх у адпаведныя слупкі.

1. Дайце азначэнне паняцця “Пояс”.
2. Знайдзіце на карце Беларусі горад Слуцк.
3. Знайдзіце ўсе назоўнікі ў сказе: “Максім Багдановіч – трэцяя зорка беларускага адраджэння пачатку XX стагоддзя”.
4. Вызначыце, колькі разоў вам давядзецца закіпяціць двухлітровы імбрык, каб напаіць гарбатай клас з 25 чалавек пад час літаратурнай гульні “Чорны кот”, прысвечанай Максіму Багдановічу. Ёмістасць шклянкі – 200 мл.

| Веды | Кампетэнтнасць | Навык | Уменне |
|---|---|---|---|
| *1* | *4* | *3* | *2* |

***Знаёмства з тэарэтычным матэрыялам.***

Кампетэнтнасна арыентаванае заданне – гэта такі від дзейнасці вучня, які патрабуе выкарыстання ведаў ва ўмовах нявызначанасці, за межамі навучальнай сітуацыі, якая арганізуе дзейнасць вучня, а не патрабуе прайгравання ім інфармацыі або асобных дзеянняў. Мэтай КАЗ з’яўляецца фарміраванне ключавых кампетэнцый, накіраваных на ўменне прымяняць атрыманыя веды ў розных жыццёвых сітуацыях. Такія заданні дазваляюць навучыць пошуку і апрацоўцы інфармацыі, уменню публічна выступаць перад аднакласнікамі, адказваць на пастаўленыя пытанні.

КАЗ характарызуюцца наступнымі паказчыкамі: кантэкстам (жыццёвасць тэматыкі заданняў) і дзейнасным кампанентам (вызначэнне віду дзейнасці, на праверку якіх накіраваны заданні па фарміраванні той ці іншы аспект кампетэнцыі).

КАЗ складаецца: са стымулу, з задачнай фармуліроўкі, крыніцы інфармацыі і інструмента ацэньвання.

***Работа ў групах (прыём “Чытанне з алоўкам”).***

**Заданне.** Прачытайце сваю частку тэарэтычнага матэрыялу, вызначце ключавыя пазіцыі структуры КАЗ.

Група I. Стымул стварае кантэкст задання і матывуе на яго выкананне, для гэтага ён павінен быць цікавым і значным для вучняў, несці пэўную эмацыйную нагрузку. Да стымулу прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: быць як мага больш кароткім, яркім, арыгінальным. Лепш распрацоўваць стымул на матэрыяле, блізкім і актуальным для вучняў, з улікам іх узросту. Змест фармуліроўкі стымулу, выкладзены ў кароткай форме, павінна даць уяўленне аб карысці атрыманага выніку ад выканання прапанаванага задання.

Група II. Задачная фармуліроўка ўяўляе сабой планаванне дзейнасці вучня, паколькі адназначна апісвае тую дзейнасць, якую ён павінен рабіць (у тэксце задання павінна быць паказана, што рабіць, і ёсць указанне на тое, як рабіць).

Пры вызначэнні задачнай фармуліроўкі неабходна ўлічваць, што заданне павінна (быць): сфармуліравана з улікам узроўню падрыхтоўкі вучняў; сфармуліравана як сітуацыя або праблема; сфармуліравана карэктна і пачынацца з дзеяслова дзеянні, затым – кантэкст самога задання; скіравана на ўказанне вучню на тую дзейнасць, якую ён павінен зрабіць; адпаведнай узросту вучняў, быць цікавым для іх; змяшчаць патрабаванні да спосабу прадстаўлення вынікаў работы; суадносіцца з інструментам праверкі, паказваць на патрабаванні да адказу; комплексным; ацэнена.

Група III. Крыніца інфармацыі можа ўтрымліваць інфармацыю аднаго віду (тэкст, малюнак, табліца і інш.) ці спалучаць асобныя віды інфармацыі. Асаблівасць крыніцы ў тым, што яна можа быць простай (утрымліваць інфармацыю аднаго віду – толькі тэкст, толькі карціна ці толькі табліца) ці быць складанай (змяшчаць аўдыёвізуальную або вербальна-графічную інфармацыю). Пры выкарыстанні некалькіх крыніц пажадана, каб яны былі прадстаўлены рознымі жанрамі, відамі: графікі, артыкулы, відэаматэрыялы і іншае.

Неабходна памятаць, што вучань марнуе час і сілы на тое, каб вывучыць крыніцы. Таму важна паклапаціцца аб тым, каб крыніца была эфектыўнай і дазваляла выканаць заданне пры мінімальных выдатках. КАЗ не павінен грунтавацца толькі на крыніцы, а абапірацца на набытыя веды вучняў.

***Работа ў парах (прыём "Пазл").***

**Заданне.** З прапанаваных тэзісаў-пазлаў выберыце тыя, якія падыходзяць да структурных элементаў КАЗ: стымул (група I), задачная фармуліроўка (II), ключ праверкі і крыніца інфармацыі (III).

1. Абавязкова завяршаецца пытаннем, на якое прапануецца адказаць і/або заданнем, якое трэба выканаць.

2. Дакладна ўказвае на дзейнасць вучня, неабходную для выканання задання.

3. Задае структуру прад'яўлення вучням выніку сваёй дзейнасці па выкананні задання.

4. Звычайна да адной сітуацыі (стымулу) прапануецца іх некалькі.

5. Змяшчае інфармацыю, неабходную для паспяховай дзейнасці вучня па выкананні задання.

6. Мадэлюе практычную, жыццёвую сітуацыю.

7. Матывуе вучня на выкананне задання.

8. Павінен быць кароткім (не больш за тры прапановы).

9. Павінна разумецца адназначна, адпавядаць узросту вучня, быць яму цікавай.

10. Пагружае ў кантэкст задання.

Прыгадаем, што ў Беларусі 2021 год абвешчаны годам малой Радзімы. 2022 – годам гістарычнай памяці, 2023 – годам міру і стварэння.




Для стварэння КАЗ звярнемся да здабыткаў нацыянальнай спадчыны Беларусі – слуцкіх паясоў. А ў якасці літаратурнага твора абярэм верш “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча.

***Гучыць відэазапіс выразнага чытання верша “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча ў выкананні супрацоўнікаў АТН.***

***Работа ў групах.***

*Пад час выканання гучыць песня “Слуцкія ткачыхі” ў выкананні Валерыя Дайнекі.*

– Вызначэнне ключавых кампетэнтнасцей, якія неабходна раскрыць у КАЗ. *(Літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная.)* У якасці крыніцы інфармацыі разглядаецца верш “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча, альбом “Слуцкія паясы”.

– У якасці стымулу бярэцца выказванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі: “Слуцкія паясы лішні раз нагадваюць простую ісціну, на якой трымаецца наша зямля: шчаслівае тое грамадства, дзе арганічна сплятаюцца духоўныя каштоўнасці і матэрыяльныя сілы, традыцыі і навацыі, мінулае і будучае...”.



– На аснове ідэйна-мастацкага зместу лірычнага твора Максіма Багдановіча, неабходна скласці задачныя фармуліроўкі, якія будуць пачынацца з прапанаваных дзеясловаў.

| Група I | Група II | Група III |
|---|---|---|
| 1. Падзяліце …<br>2. Акрэсліце …<br>3. Падумайце …<br>4. Знайдзіце … | 1. Назавіце …<br>2. Апішыце ...<br>3. Агучце ...<br>4. Вызначце … | 1. Вылучыце …<br>2. Растлумачце ...<br>3. Паразважайце …<br>4. Растлумачце … |

| Група I | Група II | Група III |
|---|---|---|
| *1. Падзяліце верш “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча на логіка-сэнсавыя часткі.*<br>*2. Акрэсліце настрой кожнай з іх.*<br>*3. Падумайце, чаму другая частка заканчваецца шматкроп’ем.*<br>*4. Знайдзіце сродкі мастацкай выразнасці ў творы.* | *1. Назавіце ключавы (асноўны) мастацкі(-ія) вобраз(-ы) верша верша “Слуцкія ткачыхі” М.Багдановіча.*<br>*2. Апішыце слуцкіх ткачых. Якія рысы характару ўкладзены ў іх.*<br>*3. Агучце, асноўную ідэю верша, сцверджаную паэтам праз вобраз слуцкіх ткачых.*<br>*4. Вызначце, зыходзячы з ключавога мастацкага вобраза, тэму лірычнага твора.* | *1. Назавіце асноўныя вобразы верша “Слуцкія ткачыхі” М.Багдановіча.*<br>*2. Растлумачце ролю вобраза-сімвала васілька ў творы.*<br>*3. Паразважайце, ці ўдалося М.Багдановічу стварыць захапляльны краявід роднай Беларусі.*<br>*4. Растлумачце колеравы аспект лірычнага твора.* |

– Паспрабуем сфармуліраваць форму прадстаўлення вынікаў уласнай дзейнасці, якая пачынаецца спалучэннем слоў: “Уявіце, што вы з’яўляецеся…”.

| Група I | Група II | Група III |
|---|---|---|
| *Уявіце, што вы з’ўляецеся загадчыкам аддзела рэкламы ў выдавецтве “Адукацыя і выхаванне”. І вам неабходна скласці рэкламу-анатацыю да верша “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча. Аформіце свой адказ у выглядзе тэксту памерам нет больш за 6 сказаў.* | *Уявіце, што вы з'яўляецеся аператарам мабільнай сувязі. І вам кіраўніцтва дарыла скласці і разаслаць СМС абанентам сеткі пра каштоўнасць верша “Слуцкія поясы” М. Багдановіча. Аформіце свой адказ у выглядзе паведамлення памерам не больш за 100 знакаў* | *Уявіце, што вы з'яўляецеся студэнтам 1-га курса журфака БДУ. І вам трэба падрыхтаваць сцэнарый міні-рэпартажу ў выпуск навін пра верш “Слуцкія поясы” М. Багдановіча. Аформіце свой адказ у выглядзе адкрытай справаздачы памерам не больш 45 слоў.* |

***Знаёмства з узорам КАЗ майстра.***

<u>Ключавая кампетэнтнасць:</u> літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная.

Стымул. “Слуцкія паясы  лішні раз нагадваюць простую ісціну, на якой трымаецца наша зямля: шчаслівае тое грамадства, дзе арганічна сплятаюцца духоўныя каштоўнасці і матэрыяльныя сілы, традыцыі і навацыі, мінулае і будучае...” (А.Р.Лукашэнка).

Задачная фармуліроўка. 1. Агучце ключавыя вобразы верша “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча. 2. Вылучыце пошукі літаратурнага героя твора. 3. Дакажыце, што верш “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча спалучае ў сваім змесце як традыцыю, так і наватарства. 4. Паразважайце над зместам радкоў “замест персідскага ўзора, цвяток радзімы васілька”. 5. Вылучыце, чаму верш “Слуцкія ткачыхі”, напісаны М. Багдановічам у 1912 годзе, не страціў сваёй актуальнасці ў першай чвэрці XXI стагоддзя.

Форма прадстаўлення. Уявіце, што вы з’яўляецеся адным з арганізатараў літаратурнай вечарыны, прысвечанай юбілею Максіма Багдановіча, і вам трэба падрыхтаваць на аснове зместу верша “Слуцкія ткачыхі” інтэлектуальную гульню “Чорны кот” па тэме “Сімвал краіны: слуцкі пояс ці васілёк?”.

Крыніца інфармацыі. Верш “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіча, альбом “Слуцкія паясы”, энцыклапедыя “Максім Багдановіч.




**V. Падвядзенне вынікаў**

***Франтальная работа (прыём “Выбар”).***

Звернемся да вашых чаканняў на пачатку майстар-класа і пагаворым адносна вашага выбару. *(Кожная пазіцыя абгаворваецца майстрам і ставіцца знак “√” чырвонага колеру.)*

| | |
|---|---|
| 1 | Пазнаёміцца з КАЗ, якія спрыяюць развіццю ключавых кампетэнцый |
| 2 | Пазнаёміцца са структурай КАЗ |
| 3 | Даведацца на якіх этапах урока мэтанакіравана выкарыстоўваць КАЗ |
| 4 | Навучыцца самастойна / калектыўна складаць КАЗ |
| 5 | З карысцю для сябе правесці час |

(Майстар тлумачаць вынікі дзейнасці па кодным паказчыку.)

***Індывідуальная работа (прыём “Лесвіца дасягненняў”).***

Заданне. На дошцы прымацаваны плакат з намаляванымі прыступкамі лесвіцы з надпісамі, прымацуйце магніт аранжавага колеру на абранай вамі прыступцы.

выкарыстоўваю КАЗ

ведаю пра КАЗ, спрабаваў выкарыстоўваць

нешта чуў пра КАЗ, але сам не выкарыстоўваў

сустракаюся з КАЗ упершыню

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Есіс, Я.В. Беларуская літаратура: планы-канспекты ўрокаў. 8 клас (І паўгоддзе): дапаможнік для педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Я.В.Есіс. – Мазыр: Выснова, 2021. – 119 с.
2. Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе: дапаможнік для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. – Мінск: Аверсэв, 2008. – 255 с.
3. Максім Багдановіч: энцыклапедыя / склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларускай энцыклапедыя імя П. Броўка, 2011. – 608 с.
4. Пашкевич, А. В. Оцениваем метапредметные результаты. Стратегии и методы оценивания. Проектирование заданий, тестов, задач / А. В. Пашкевич. – Волгоград: Учитель, 2015. – 135 с.
5. Пінголь, І. А. Беларуская літаратура: 8-мы клас: дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / І. А. Пінголь. – Мінск: Сэр-Віт, 2019. – 40 с.
6. Слуцкія паясы: мастацтва, асобы, эпоха: альбом / укладальнік Б.А.Лазарук. – Мінск: Беларусь, 2015.

## Педагагічная майстэрня “4:1: вынік відавочны. Прыём РАФТ пры навучанні стварэнню тэкстаў”

*Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна*
*дырэктар ДУА “Сярэдняя школа №10 г.Жлобіна”,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*

Зварот да прыёму “РАФТ-тэхналогія” быў выкліканы ўвядзеннем у 2022/2023 навучальным годзе новай формы кантролю – тэставых работ з часткай С. У пошуках новай формы работы з вучнямі па падрыхтоўцы да міні-сачынення былі разгледжаныя і выкарыстаныя многія прыёмы, але самыя лепшыя вынікі дэманструе выкарыстане прыёму “РАФТ-тэхналогія”.

Прыём вядомы з 80-ых ХХ стагоддзя і выкарыстоўваўся на ўроках па прадметах гуманітарнага цыклу (літаратуры, гісторыі). Прыём накіраваны на стварэнне тэкстаў рознай тэматыкі і накіраванасці, прадугледжвае напісанне твораў у розных жанрах. Прыём не абмяжоўвае творчую фантазію вучняў і настаўніка, таму станоўча ўспрымаецца школьнікамі, матывуе іх да работы. Ствараючы тэкст ад імя пэўнага героя, вучні пазбаўляюцца скаванасці, што здымае іх напружанасць.

Майстар-класс па тэме “4:1: вынік відавочны” мае мэтай знаёмства настаўнікаў беларускай мовы з прыёмам і фарміраванне свядомага жадання паспрабаваць выкарыстаць прыём у сваёй педагагічнай дзейнасці (у прыватнасці, пры падрыхтоўцы вучняў да работы з часткай С тэставых работ). Адсюль і назва майстар класа – 4 літары РАФТ супраць адной С.

На жаль, прыём мала выкарыстоўваецца ў дзейнасці настаўнікаў-моваведаў, таму ў метадычнай літаратуры фактычна не прадстаўлены. Сабраны ў майстар-класе матэрыял узяты з уласнага вопыту настаўніка.

**Тэма: 4:1: вынік ідавочны**

**Вядучы майстар-класа:** Рашук Алена Міхайлаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 10"

**Мэта:** мяркуецца, што да заканчэння майстар-класа ўдзельнікі будуць мець уяўленне пра прыём "РАФТ-тэхналогія" і магчымасці яго выкарыстання пры падрыхтоўцы вучняў да тэставых работ з часткай С.

**Задачы:**

стварыць умовы для матывацыйнай падрыхтаванасці ўдзельнікаў майстар-класа да азнаямлення з прыёмам "РАФТ-тэхналогія" для работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы з мэтай падрыхтоўкі вучняў да тэставых работ з часткай С;

садзейнічаць усведамленню ўдзельнікамі значнасці атрыманага вопыту.

**Абсталяванне:** інтэрактыўная панэль, мультымедыйная прэзентацыя; раздатачны матэрыял, канцылярскія прылады.

**Ход майстар-класа**

Удзельнікі майстар-класа пры ўваходзе ва аўдыторыю выбіраюць карткі з літарамі А, Р, Т, Ф і ўтвараюць адпаведныя чатыры групы.

| Этапы работы майстар-класа | Змест этапу | Дзейнасць педагога | Дзейнасць удзельнікаў |
|---|---|---|---|
| **1. Арыентацыйна-матывацыйны этап** | *Задача*: стварыць умовы для сумеснай дзейнасці ўдзельнікаў майстар-класа, забяспечыць іх матывацыю | | |
| | Майстар вітае ўдзельнікаў.<br>*Прыём "Давайце пазнаёмімся".* | Стварае сітуацыю для знаёмства, арганізацыі ўвагі, наладжвання супрацоўніцтва. | Уключаюцца ў работу. |
| | Прапаноўваецца агучыць свае чаканні ад МК, карыстаючыся словамі, якія пачынаюцца з літар А, Р, Т, Ф<br>*Прыём "Алітарацыя".*<br>(Дадатак 1) | Засяроджвае ўвагу на ключавых літарах, выяўляе тых удзельнікаў, якія дасведчаныя ў тэме МК. | Выказваюць свае здагадкі пра змест МК. |
| **2. Этап актуалізацыі суб'ектыўнага вопыту** | *Задача*: стварыць праблемную сітуацыю, вызначыць узровень падрыхтаванасці ўдзельнікаў да ўспрымання тэмы. | | |
| | Выходзяць па адным удзельніку ад кожнай групы з адпаведнай літарай, | Вызначае праблемнае поле майстар-класа, далучае да гутаркі | Прымаюць удзел у гутарцы, усведамляюць значнасць |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ствараюць слова.<br><br>Вызначэнне тэмы майстар-класа. | з мэтай актывізацыі наступнай дзейнасці. | праблемы і неабходнасць яе вырашэння. |
| **3. Мэтавызна-чэнне** | *Задача*: забяспечыць асобаснае мэтавызначэнне, канкрэтызаваць чаканні ўдзельнікаў майстар-класа. | | |
| | Вызначэнне задач майстар-класа.<br>*Прыём "Выбар"*<br>(Дадатак 2) | Прапаноўвае некалькі задач, з якіх удзельнікі выбіраюць задачы майстар-класа. | Вызначаюць задачы і прадстаўляюць іх. |
| **4. Інфармацыйна-дзейнасны этап** | *Задача*: стварыць умовы для набыцця тэарэтычных ведаў па акрэсленай тэме, пазнаёміць з прыёмам "РАФТ-тэхналогія" пры рабоце з тэкстам; арганізаваць практычную дзейнасць па засваенні прыёму для работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы з мэтай падрыхтоўкі да тэставых работ з часткай С; стварыць сітуацыю ўзаемадзеяння. | | |
| **4.1. Тэарэтычны блок** | Работа ў групах.<br>*Прыём "Табліца-канструктар"*<br>(Дадатак 3)<br>Фарміраванне задання да тэксту "Ганарлівая елачка" па матэрыяле прапанаванай табліцы<br>(Дадатак 4) | Знаёміць з асаблівасцямі прыёму "РАФТ-тэхналогія". Дэманструе магчымасці прыёму пры рабоце з тэкстам на ўроках беларускай мовы ў 5 класе. | Абмяркоўваюць звесткі і ствараюць табліцу. Ствараюць варыянты заданняў да тэксту, прадстаўляюць вынікі работы груп. |
| **4.2. Практычны блок** | Работа ў групах. Напаўненне зместам РАФТ-табліцы да тэксту з выкарыстаннем алгарытму<br>(Дадаткі 5, 6) | Дэманструе магчымасці прыёму пры падрыхтоўцы вучняў да напісання тэставых работ з часткай С. Прапаноўвае запоўніць удзельнікам груп РАФТ-табліцу да тэкстаў. Кансультуе ўдзельнікаў МК. | Абмяркоўваюць і выконваюць прапанаванае заданне, прадстаўляюць вынікі работы груп. |
| **5. Рэфлексіўна-ацэначны этап** | *Задача*: стварыць умовы для магчымасці ацаніць ступень дасягнення пастаўленых задач, вызначыць значнасць атрыманых ведаў для выкарыстання ў далейшай педагагічнай дзейнасці. | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | *Прыём “Адкрыты мікрафон”.* Выяўленне ўзроўню здзяйснення чаканняў удзельнікаў майстар-класа. | Прапаноўвае звярнуцца да табліцы “Характарыстыкі РАФТ-тэхналогіі” і вызначыць станоўчыя і адмоўныя (пры наяўнасці) бакі тэхналогіі. (Дадатак 6) Звяртае ўвагу на пастаўленыя задач, неабходнасць вызначыць ступень іх дасягнення і значнасць атрыманых ведаў для выкарыстання ў далейшай педагагічнай дзейнасці. | Удзельнікі аналізуюць магчымасці выкарыстання прыёма ў сваёй педагагічнай дзейнасці, звяртаюцца да пастаўленых задач, асэнсоўваюць вынікі работы на майстар-класе, суадносяць атрыманыя веды са сваімі чаканнямі, выказваюць свае меркаванні. |

**Дадатак 1**

**Прыём “Алітарацыя”**

Сутнасць прыёму ў падборы слоў пэўнай тэмачынай групы да акрэсленай літары.

*Узор*:

Р – рацыянальны, работа, развіццё, рэзультат…

А – адукацыйны, адкрыты, асэнсаваць, ацаніць…

Ф – функцыянальны, фантазія, форма…

Т – творчасць, тэкст, тэсціраванне…

**Дадатак 2**

**Прыём “Выбар”**

Сутнасць прыёму ў выбары з прапанаваных варыянтаў таго, які адпавядае пазіцыі ўдзельніка майстар-класа. З прапанаваных магчымых задач удзельнікі выбіраюць тры тыя, якія, на іх думку, могуць быць вырашаныя ў рамках дадзенага майстар-класа.

*Узор*:

пазнаёміцца з прыёмам “РАФТ-тэхналогія”;

даведацца пра асаблівасці выкарыстання прыёму “РАФТ-тэхналогія” на ўроках беларускай мовы;

вызначыць магчымасці выкарыстання прыёму “РАФТ-тэхналогія” пры падрыхтоўцы вучняў да работы з тэстамі з часткай С;

набыць вопыт выкарыстання прыёму “РАФТ-тэхналогія” пры рабоце з вучэбным тэкстам;

навучыцца ствараць заданні да тэксту з выкарыстаннем прыёму “РАФТ-тэхналогія”;

атрымаць рэкамендацыі па выкарыстанні прыёму “РАФТ-тэхналогія” на ўроках беларускай мовы.

**Дадатак 3**

**Прыём “Табліца-канструктар”**

Сутнасць прыёму ў тым, каб прапанаваць удзельнікам майстар-класа табліцу, элементы якой трэба злучыць у выніку ўзаемадзеяння ў групе, асэнсоўваючы вопыт майстра.

*Узор:*

| Р | А | Ф | Т |
|---|---|---|---|
| роля | аўдыторыя | форма | тэма |
| ХТО можа напісаць тэкст | ДЛЯ КАГО можа быць напісаны тэкст | у якой ФОРМЕ можа быць напісаны тэкст | пра ШТО будзе тэкст |

**Дадатак 4**

Выкарыстанне прыёму “РАФТ-тэхналогія” на ўроку па тэме “Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту” (5 клас) па тэксце “Ганарлівая елачка”

***Ганарлівая елачка***

*Расла ў лесе елачка. Стаяла асобна, бо занадта ганарлівая была. Дрэвы зайздросцілі ёй. Асабліва восенню ды зімой, калі ападае лістота.*

*Аднойчы пад Новы год чалавек завітаў у лес з сякерай. На месцы елачкі застаўся толькі пянёк, які зацерушыў снег. Сама елачка перасялілася ў гарадскую кватэру, дзе стаяла прыгожая, з рознакаляровымі шарамі.*

*Доўжылася свята толькі два тыдні. Затым з елачкі знялі ўпрыгожванні, вынеслі з кватэры. Ніхто не ведае, як склаўся яе лёс далей.*

*А дрэўцы ў лесе растуць як раслі. З вясны да восені шумяць лістотай. Часам згадваюць сваю ганарлівую сяброўку. Праўда, ужо без зайздрасці.*

| Р | А | Ф | Т |
|---|---|---|---|
| роля | аўдыторыя | форма | тэма |
| ХТО можа напісаць тэкст | ДЛЯ КАГО можа быць напісаны тэкст | у якой ФОРМЕ можа быць напісаны тэкст | пра ШТО будзе тэкст |
| елачка;<br>бярозка;<br>чалавек з сякерай;<br>сын чалавека з | дрэвы ў лесе;<br>іншыя елачкі;<br>людзі, якія яшчэ не купілі штучныя елкі; | ліст;<br>аб’ява;<br>дзённікавы запіс;<br>скарга;<br>выступленне на | лёс елак пасля навагодніх свят |

| | | | |
|---|---|---|---|
| сякерай;<br>дворнік;<br>ахоўнік прыроды | жыхары дома;<br>школьнікі | класнай гадзіне | |

Заданне ўдзелькам майстар-класа: сфармуліраваць заданне па тэксце з выкарыстанне прыёму "РАФТ-тэхналогія".

*Узоры выкананых заданняў:*

Раскажыце пра лёс елак пасля навагодніх свят ад імя дворніка ў форме аб'явы для жыхароў дома.

Раскажыце пра лёс елак пасля навагодніх свят ад імя сына чалавека з сякерай у форме запісу ў дзённіку, звернутага да людзей, якія яшчэ не купілі штучныя елкі.

**Дадатак 5**

Алгарытм работы настаўнікаў пры выкарыстанні прыёму "РАФТ-тэхналогія"

Выберыце цікавы тэкст, магчымасці якога дазваляюць у поўнай меры выкарыстаць прыём.

Пазнаёмце вучняў з РАФТ-табліцай.

Правядзіце мазгавы штурм для вызначэння магчымых роляў (сацыяльных груп), што могуць быць задзейнічаныя ў дадзенай тэме. Пасля вызначэння запоўніце першую калонку табліцы назвамі роляй (4-5).

Правядзіце мазгавы штурм з мэтай вызначэння магчымай аўдыторыі (пералічыце канкрэтных людзей ці ўстановы, якім могуць быць адрасаваныя пісьмовыя тэксты). Запоўніце другую калонку табліцы.

Правядзіце мазгавы штурм, каб вызначыць магчымыя жанры. Памятайце, што яны павінны быць адэкватнымі ў дачыненні да сацыяльных роляў і аўдыторыі. Вынікі занясіце ў трэцюю калонку.

Правядзіце мазгавы штурм і вызначце тэматыку тэксту (галоўную ідэю, якая будзе закранута ў ім).

Размяркуйце сацыяльныя ролі паміж вучнямі, удакладніце аб'ем тэксту. Патлумачце вучням, што ім неабходна адчуць сябе пэўным героем, не забываючы пра абставіны, у якіх можа апынуцца персанаж.

Стварыце ўмовы для работы вучняў з дадатковымі крыніцамі інфармацыі (даведачнай літаратурай, мастацкімі тэкстамі, мастацкімі і дакументальнымі фільмамі і інш.).

Пасля напісання тэкстаў арганізуйце работу малых груп з мэтай выбару лепшых тэкстаў. Пры наяўнасці часу дазвольце кожнаму з вучняў прачытаць свой тэкст.

Арганізуйце праслухванне і аналіз тэкстаў. Ацаніце дзейнасць вучняў.

**Дадатак 6**

Заданне для настаўнікаў па прымяненні прыёму "РАФТ-тэхналогія"

Запоўніце РАФТ-табліцу да прапанаванага тэксту:

*Што такое пайсці для дзіцяці ў школу, усе ведаюць. Гэта – і вялікая надзея, і немалая перамена ў жыцці, і новыя хваляванні ды трывогі, і велізарная радасць ды доўгая, без канца і краю, дарога ў навуку, да спазнання. Тым больш*

*усё гэта было ашаламляльнае і важнае для мяне: я нарадзіўся і гадаваўся на хутары, дзе было ўсяго некалькі аддаленых адна ад адной хат, не мелася яшчэ электрычнага святла. Дык для мяне дарога ў вёску, да людзей, навучанне ў школе, дзе было электрычнае святло, радыё, а таксама досыць вялікая бібліятэка тоўстых і тоненькіх, з малюнкамі кніг, стала, можна сказаць, дарогаю ў вялікі свет. Канечне, свет той быў не такі ўжо вялікі, але для мяне, тагачаснага, быў, паўтару, не малы.*

| Р | А | Ф | Т |
|---|---|---|---|
| роля | аўдыторыя | форма | тэма |
| ХТО можа напісаць тэкст | ДЛЯ КАГО можа быць напісаны тэкст | у якой ФОРМЕ можа быць напісаны тэкст | пра ШТО будзе тэкст |
| | | | |

**Дадатак 7**

Характарыстыкі прыёму "РАФТ-тэхналогія"

Удзельнікам майстар-класа прапаноўваецца выбраць характарыстыкі прыёму з табліцы і абгрунтаваць свой выбар.

| **Станоўчыя бакі** | **Адмоўныя бакі** |
|---|---|
| Не патрабуе вялікіх затрат па часе ад настаўніка пры падрыхтоўцы да ўрока | Патрабуе вялікіх затрат па часе ад настаўніка па падрыхтоўцы да ўрока |
| Нескладаны ў прымяненні для вучняў любога ўзросту | Складаны ў прымяненні, патрабуе абмежанняў па ўзросце вучняў |
| Дазваляе разглядзець тэму тэксту з розных бакоў і пунктаў гледжання | Не дазваляе разглядзець тэму з розных бакоў і пунктаў гледжання |
| Фарміруе ўменне ствараць пісьмовыя тэксты | Не спрыяе фарміраванню ўмення ствараць уласныя тэксты |
| З'яўляецца спосабам навучання крытычнаму мысленню, фарміруе сістэму меркаванняў | Дзейнасць вучняў пры выкарыстанні прыёму носіць рэпрадуктыўны характар |
| Вучыць аналізаваць праблемы, фармуляваць свае ўласныя вывады, даваць свае ацэнкі | Не спрыяе развіццю ўмення аналізаваць, ацэньваць, падагульняць |
| Універсальны прыём, які можна выкарыстоўваць на ўроках па многіх вучэбных прадметах і ў выхаваўчай рабоце | Выкарыстанне прыёму абмежавана толькі ўрокамі беларускай мовы |

**Педагагічная майстэрня “Выкарыстанне прыёма “Трыміно” на розных этапах ўрока для дасягнення вынікаў навучання”**

*Шаўчэнка Таццяна Мікалаеўна*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Сярэдняя школа №7 г.Жлобіна”*

**Мэта** стварыць умовы для ўдасканалення прафесійнага майстэрства настаўніка шляхам засваення сутнасці і спосабаў прымянення прыёму “Трыміно”.

**Задачы:**

раскрыць сутнасць і асаблівасці прыёму “Трыміно”;

садзейнічаць фарміраванню навыкаў распрацоўкі заданняў для прыёму “Трыміно”;

стварыць умовы для самарэалізацыі педагогаў і стымулявання іх прафесійнага росту шляхам стварэння прадукта сумеснай творчай дзейнасці з выкарыстаннем прыёму “Трыміно”.

**Абсталяванне:** дошка, праектар, лісты паперы А4, падручнікі беларускай мовы (6 клас), беларускай літаратуры (6 клас).

**Ход майстар-класа**

У сучасным адукацыйным працэсе настаўніку неабходна канцэнтраваць увагу на тых відах дзейнасці, якія накіраваны на эфектыўнае дасягненне сукупнасці прадметных, метапрадметных і асобасных вынікаў. На ўроках вучань працуе актыўна і захоплена, калі прысутнічае пазнавальная цікавасць, калі ў вучня праяўляецца дапытлівасць.

Даводзіцца шукаць эфектыўныя метады навучання, прыёмы і тэхнікі, якія актывізавалі б думку школьнікаў, стымулявалі б іх да самастойнай працы.

***I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.***

Размеркаванне ўдзельнікаў па групах. Знаёмства.




– Звярніце ўвагу на слайд. Што вы бачыце на ілюстрацыі?

– Як лічыце, ці магчыма выкарыстанне даміно ў нашай педагагічнай практыцы?

– Хачу падзяліцца вопытам выкарыстання прыёма, які вельмі нагадвае даміно. Гэты прыём называецца “Трыміно”.



***II. Мэтавызначэнне.***

Мяркуецца, што напрыканцы занятка ўдзельнікі

змогуць назваць асаблівасці прыёму “Трыміно”;

будуць ведаць алгарытм працы з прыёмам;

вызначаць спосаб выкарыстання прыёма на ўроках беларускай мовы, беларускай літаратуры;

распрацуюць заданні для для вучняў з выкарыстаннем прыёму “Трыміно”.

***III. Інфармацыйна-дзейнасны этап.***

**1. Сутнасць прыёму “Трыміно”.** Сутнасць прыёму заключаецца ў тым, што вучням неабходна суаднесці паняцці і іх азначэнні, словы і іх значэнні. Так, на розных баках разрэзаных трохвугольнікаў змяшчаецца інфармацыя ў фармаце “пытанне-адказ” або “паняцце-азначэнне”. Вучням патрэбна правільна супаставіць інфармацыю, размясціўшы пытанне і адказ побач. У выніку з трохвугольнікаў атрымліваецца вялікая геаметрычная фігура. Менавіта правільна складзеная фігура дае падставу меркаваць, што трохвугольнікі суаднесены правільна. Умовы выканання заданняў на ўроках могуць вар'іравацца.

**2. Алгарытм распрацоўкі “Трыміно”.**

Асноўная праца настаўніка заключаецца ў распрацоўцы заданняў для гэтага прыёму. Распрацаваныя заданні змяшчаюцца ў праграму FormulatorTarsia.

Увогуле “FormulatorTarsia – дадатак, прызначаны для настаўнікаў матэматыкі, якія праводзяць заняткі з выкарыстаннем розных картак-галаваломак. Пры дапамозе FormulatorTarsia можна ствараць гэтакія матэматычныя пазлы з картак прамавугольнай і трохвугольнай формы.

Такім чынам, алгарытм працы настаўніка з дадзеным прыёмам можа выглядаць наступным чынам:

выбар тэмы вучэбнай праграмы.

вызначэнне мэты, задачы выкарыстання прыёма, адрасата.

адбор вучэбнага матэрыялу для задання.

стварэнне пазлаў у праграме FormulatorTarsia.

афармленне "Трыміно".

**Інструкцыя працы з "Трыміно" для вучняў**

1. Уважліва разгледзь інфармацыю на трохвугольніках
2. Суаднясі паняцце і яго азначэнне так, каб яны размяшчаліся побач
3. Вынікі працы аформі ў выглядзе геаметрычнай фігуры
4. Пры ўзнікненні цяжкасцей звярніся да адпаведнай тэмы ў падручніку

**Алгарытм працы настаўніка**

Выбар тэмы вучэбнай праграмы.

Вызначэнне мэты, задачы выкарыстання прыёма, адрасата.

Адбор вучэбнага матэрыялу для задання.

Стварэнне пазлаў у праграме FormulatorTarsia.

Афармленне "Трыміно".

**1. Выкарыстанне на ўроках.**

Прыём "Трыміно" можна выкарыстоўваць на розных этапах урока. З дапамогай дадзенага прыёму можна правесці актуалізацыю ведаў франтальна, праверку дамашняга задання. Найбольш эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне прыёма "Трыміно" для замацавання і абагульнення ведаў як на ўроках мовы, так і літаратуры. Прыём прымяняецца часцей за ўсё для працы ў парах, групах, і тады іх выкананне носіць спаборніцкі характар. Але вучні спраўляюцца з заданнем і індывідуальна, толькі гэта займае ў іх больш часу.

Прыём "Трыміно" універсальны тым, што заданні выконваюць вучні рознага ўзроўню. Так, вучням з больш высокім узроўнем навучанасці можна не даваць макет геаметрычнай фігуры, дзеці фігуру павінны скласці самі (па прынцыпе пазлаў) або вучні складаюць самастойна не толькі макет, але і заданні. А для вучняў з нізкай матывацыяй, сярэднімі здольнасцямі дэмантсруецца макет геаметрычнай фігуры, якая павінна ў выніку атрымацца.

***IV. Практычнае заданне на прымяненне атрыманых ведаў.***

Настаўнікам прапануецца выканаць заданні (у групах)

**1 група**

Складзіце алгарытм працы з "Трыміно" для вучняў (3-4 пункты) і аформіце на лістах паперы А4.

**2 група**

Прачытайце вучэбны матэрыял "Міфы" (урок беларускай літаратуры, раздзел "Фальклор і літаратура", 6 клас).

Складзіце 4 заданні для "Трыміно", падабраўшы да азначэнняў паняцці, па тэме "Міфы". Аформіце на лістах А4 у выглядзе табліцы.

**3 група**

Прачытайце вучэбны матэрыял па тэме "Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў" (урок беларускай мовы, 6 клас). Складзіце 4 заданні для "Трыміно", падабраўшы пытанні (або азначэнні) да прапанаваных слоў. Аформіце на лістах А4 у выглядзе табліцы.

**4 група**

Разгледзьце геаметрычную фігуру з заданнямі. Прапануйце варыянт прымянення прыёма "Трыміно" на розных этапах ўрока (не меней двух),

абгрунтуйце свой выбар (урок беларускай літаратуры, раздзел “Фальклор і літаратура”, 6 клас, тэма “Міфы”).

Адказ аформіце на лісце паперы А4: тэма ўрока, этап урока, вучэбная задача (для чаго выкарыстоўваецца, з якой мэтай) выкарыстання прыёма.

**5 група**

Разгледзьце геаметрычную фігуру з заданнямі. Прапануйце свой варыянт прымянення прыёма “Трыміно” на розных этапах (не меней двух) ўрока, абгрунтуйце свой выбар (урок беларускай мовы , раздзел “Марфалогія”, 6 клас, тэма “Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў”.

Адказ аформіце на лісце паперы А4: тэма ўрока, этап урока, вучэбная задача (для чаго выкарыстоўваецца, з якой мэтай) выкарыстання прыёма.

***V. Прадстаўленне вынікаў працы. Падагульненне***

Прыём “Трыміно” з'яўляецца не толькі эфектыўным спосабам павышэння матывацыі вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры, але і сродкам павышэння якасці ведаў па прадмеце. З дапамогай дадзенага прыёму можна адпрацоўваць новыя тэрміны і паняцці, замацоўваць вывучаны матэрыял. Пасля засваення вучнямі спосабаў работы з прыёмам можна прапанаваць вучням самім скласці “Трыміно” па вывучанай тэме”.

***VI. Кантрольна-дыягнастычны этап.***

Зварот да задач майстэрні.

Назавіце парадак працы па складанні заданняў “Трыміно” для настаўніка?

Парадак працы з “Трыміно” для вучня?

На якіх этапах урока можна выкарыстоўваць дадзены прыём?

## Спіс літаратуры

1. Валочка, Г.М. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання /Г.М.Валочка і інш. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020.

2. Бельскі, А.І., Цітова, Л.К., Навумчык, М.І. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання /А.І. Бельскі, Л.К.Цітова, М.І.Навумчык – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022.

3. Інтэрнэт-рэсурс https://soft.mydiv.net/win/download-FormulatorTarsia.html.